**Падпішыся на «Звязду» і выйграй... бочку**



Падпісны купон — ўжо ў гэтым нумары

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 103 (28719)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр КРУЧАНАЎ, першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Цяпер неабходна гаварыць аб стварэнні жылога асяроддзя. Гэта квартал забудовы, які ўключае камфартабельнае жыллё, у тым ліку эканомкласа, і ўсю неабходную інфраструктуру: дзіцячы сад, школу, магазін, месцы для адпачынку. Мы зможам на падставе сусветнага вопыту, сваіх напрацовак і вынікаў даследаванняў экспертаў вызначыць, дзе ёсць магчымасць прыбавіць у горадабудаўнічай палітыцы, падыходах да праектавання, выдзяленне зямельных участкаў, будаўніцтва жылля».*

## КОРАТКА

Адной з навінак цяперашняга парада войскаў у гонар Дня Незалежнасці ў Мінску будзе тое, што па праспекце Машэрава ўпершыню пройдуць зводныя парадныя разлікі, якія складаюцца з жанчын-вайскоўцаў і навучэнцаў спецыялізаваных ліцэяў і кадэцкіх класаў.

**Музычны фестываль «Песня года Беларусі — 2018» пройдзе на цэнтральнай плошчы культурнай сталіцы краіны Наваполацка 8 чэрвеня.**

Намінацыя па беларускім абрадзе «Юраўскі карагод» у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці будзе разгледжана ЮНЕСКА ў 2019 годзе. Ён прэтэндуе на ўнясенне ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, якая патрабуе тэрміновай аховы.

**У Мёрах уведзена ў строй цэнтральная раённая бальніца. У планах на бліжэйшую перспектыву — будаўніцтва паліклінікі на 250 наведванняў у дзень.**

У цяперашні час ва ўрадзе адпрацоўваецца механізм змены рознічных цэн на аўтамабільнае паліва паводле ўзроўню цэнаў на нафту, якія склаліся. Ён стане вядомы ў бліжэйшы час.

ISSN 1990 - 763X
18103

# Вас вітае фестываль!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння і заўтра Гродна зноў ператворыцца ў адну вялікую, ветлівую і рознагалосую пляцоўку — менавіта тут пройдуць заключныя мерапрыемствы XII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Традыцыйнае свята звычаяў, нацыянальных асаблівасцяў і культурных адметнасцяў народаў, што жывуць у міры ды згодзе ў нашай краіне, чарговы раз запрашае гасцей. Гэтым разам арганізатары таксама падрыхтавалі некалькі цікавінак. Напрыклад, упершыню фестываль перанясецца на адзін дзень з Гродна і 3 чэрвеня «прызямліцца» на Аўгустоўскім канале. Аб усіх навінках і захапляльных момантах свята «Звязда» абавязкова раскажа сваім чытачам.

### ■ Месца пад сонцам

## Працягніце думку: «Я паркуюся, як ...»,

### або Дзе нельга пакідаць аўтамабіль

**У канцы працоўнага дня менш за ўсё хочацца ставіць машыну ў некалькіх кварталах ад свайго дома, а потым цягнуцца пешшу пару лішніх сотняў метраў з цяжкімі пакетамі з супермаркета. А калі з вамі яшчэ дзеці або пажылыя сваякі? Вядома, можна суцяшаць сябе тым, што прагулкі — гэта карысна для здароўя, але наўрад ці гэта спыніць раздражненне. Паміж ім і паркоўкай не па правілах дарожнага руху значная частка мінчан выбірае другі варыянт. Маўляў, што таму тратуару або газону будзе за раз... Як высветлілася, наступствы могуць быць і для газона, і для вас асабіста. Разам са спецыялістамі мы адправіліся на праверку ў адзін са сталічных двароў.**

СТАР. 4



### ■ Разумныя грошы

## А вам дадуць крэдыт?

### Чаму па новых правілах яго могуць і не даць

**Ужо прайшоў месяц, як нашы банкі па-новаму ацэньваюць плацежаздольнасць тых, хто хоча ўзяць крэдыт. Правілы гульні ў крэдыты змяніў Нацыянальны банк краіны. І зрабіў ён гэта таму, што нашы грамадзяне сталі занадта часта пазычаць на розныя пакупкі. Справа ў тым, што агульная сума доўгу насельніцтва банкам стала вельмі хутка расці, прычым без прывязкі да памераў даходаў гэтага самага насельніцтва. З'явілася асцярога, ці аддадуць своечасова або ці аддадуць наогул... Мы вырашылі разабрацца, што змянілася ў гэтай сферы, і паспрабавалі зразумець, ці стала больш складана атрымаць грошы ў крэдыт.**

### ГЛЯДЗЕЦЬ БУДУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ НА ЗАРПЛАТУ

Першае пытанне ўзнікае пра тое, як цяпер банкі вырашаюць, ці зможа кліент беспраблемна плаціць па крэдыце? Ужо месяц па новых правілах банкі павінны разлічваць для будучых крэдытаатрымальнікаў каэфіцыент пазыковай нагрузкі.

Дык вось, напрыклад, плацяжы па крэдытах на спажывецкія патрэбы не павінны перавышаць 40 % ад сярэднямесячнага даходу кліента. Пры гэтым банкі могуць самастойна вырашаць, якія канкрэтна даходы ўлічваць пры разглядзе заяўкі. Гэта могуць быць не толькі заробкі, але і працэнты па ўкладах, даходы ад здачы ў арэнду кватэры, даходы ад вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі і іншыя. Прычым прымусіць банк улічваць менавіта спецыфічныя свае даходы асобны чалавек не мае права.

СТАР. 4

# ВЫДАТКОЎВАЦЬ СТОЛЬКІ, КОЛЬКІ ТРЭБА

## На нарадзе ў Палацы Незалежнасці абмеркавалі вынікі праверкі Узброеных Сіл Беларусі

**На пачатку нарады Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што праз сродкі масавай інфармацыі грамадства інфармавалі аб тым, што ва Узброеных Сілах праводзіцца чарговая праверка. Падобныя мерапрыемствы па патрабаванні кіраўніка дзяржавы адбываюцца раптоўна, каб выявіць сапраўдны стан тых ці іншых працэсаў, якія адбываюцца ў беларускім войску.**

### ГРОШЫ ПАВІННЫ ДАВАЦЬ ВЫНІК

«Наша армія з'яўляецца адным з асноўных інструментаў дзяржавы па забеспячэнні ваеннай бяспекі. Яна павінна эфектыўна рэагаваць на сучасныя выклікі і пагрозы. І гэта найважнейшае патрабаванне», — сказаў Прэзідэнт.

Беларускі лідар адзначыў, што ў забеспячэнне і пераўзбраенне арміі дзяржава ўкладвае істотныя сродкі, а войска ўкамплектоўваецца сучаснымі відамі баявой тэхнікі, экіпіроўкай і сродкамі кіравання.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь не збіраецца ўцягвацца ў гонку ўзбраенняў, а тым больш дарма «бразгаць зброяй», аднак ваенна-палітычнае становішча, якое складваецца, не дазваляе ў цяперашні час выбудоўваць іншыя прыярытэты фінансавання дзяржаўных выдаткаў, таму і надалей на нашу бяспеку выдаткоўваць будуць столькі, колькі трэба. «Карміць трэба сваіх салдат», — дадаў ён.

Паводле слоў Прэзідэнта, укладзеныя грошы павінны даваць рэальны рост баявых магчымасцяў Узброеных Сіл і павышаць абараназдольнасць нашай дзяржавы. «Недапушчальна, каб дарагая зброя выкарыстоўвалася не ў поўную сілу, а тым больш прыходзіла ў непрыдатнасць з-за непрафесіяналізму асобных камандзіраў. Вось гэта абсалютна недапушчальна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Сёння задача стаіць не проста захаваць ці павялічыць ваенны патэнцыял нашай арміі, але і рацыянальна яго выкарыстоўваць — і гаворка ідзе не толькі пра ваенныя выдаткі. Адным з ключавых элементаў баяздольнасці з'яўляецца гатоўнасць да адмабілізавання і навучанне войскаў, асабліва афіцэраў.

«Наогул, без салдата, афіцэра, генерала ніякая зброя, ніякая армія не дапаможа, — сказаў беларускі лідар. — Любой зброяй і іншым, што знаходзіцца на ўзбраенні ў арміі, трэба ўмець карыстацца — аксіёма не толькі для ваенных, але і для ўсіх».

Менавіта на гэтыя аспекты Прэзідэнт запатрабаваў звярнуць увагу пры праверцы Узброеных Сіл.

### ПАРУШЭННІ ЗАСТАЮЦЦА, АЛЕ СКАРАЧАЮЦЦА

«Мне далажылі аб выніках гэтай праверкі. Выкрыта мноства розных недахопаў. І амаль усе яны — абсалютна суб'ектыўнага характару, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Гаворка ідзе пра фармалізм, безадказнасць і банальную неарганізаванасць, што для нас вельмі непрымальна і недапушчальна. Мы не настолькі багатыя, каб такім чынам несці службу ва Узброеных Сілах і распараджацца той маёмасцю, якую маем».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: усе людзі ў пагонах, асабліва камандзіры, павінны быць узорам прыстойнасці і добрасумленнага выканання службовых абавязкаў. Гэта датычыцца як прымянення даручаных падраздзяленняў і ўзбраенняў, так і выхавання падначаленых, бо менавіта афіцэрскаму корпусу давераны лёсы маладых людзей, з якіх яны за кароткі час павінны падрыхтаваць сапраўдных байцоў, абаронцаў Айчыны.

«Мною таксама было даручана вывучыць пытанні ідэалагічнай работы ў сувязі з тым, што яна непасрэдным чынам уплывае і на вайсковую дысцыпліну, — дадаў беларускі лідар. —Дакладваюць, што ў войску захоўваецца ўстойлівая тэндэнцыя да скарачэння колькасці правапарушэнняў, але яны ёсць».

Адносна стабільны стан спраў па карупцыйных праявах. Скарачаецца колькасць злачынстваў, звязаных з гібеллю асабовага складу пры выкананні службовых абавязкаў.

«У той жа час у 2017 годзе зафіксаваны значны рост колькасці фактаў нестатутных узаемаадносінаў. Я хацеў бы, каб мне далажылі, з чым гэта звязана, — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы. — Гэта што, сапраўды такі ўсплёск бязладдзя па так званай «няўстаўшчыне» або службовых асобы Мінабароны і іншых кампетэнтных органаў павысілі патрабавальнасць і нарэшце пачалі ўсё гэта ўлічваць?»

Паколькі на нарадзе прысутнічала ўсё вышэйшае кіраўніцтва нашай арміі, у завяршэнні Прэзідэнт асобна звярнуўся да прысутных і дадаў, што расслабляцца нельга. «Справа не ў тым, што толькі маё патрабаванне такое жорсткае ў адносінах да вас. Вы ведаеце, што расслабляцца нам нельга. Таму што падобнае расслабленне ператвараецца ў галаварцэства, безадказнасць, а яно потым дорага абыходзіцца дзяржаве і народу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### ЯКІЯ Ж ВЫНІКІ?

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Станіслаў Засъ пазней расказаў журналістам, што праверка закранула тысячы вайскоўцаў і сотні адзінак тэхнікі. Ён адзначыў, што правяраліся менавіта тыя актуальныя пытанні, якія патрабуюць асаблівай увагі ў сучасных умовах, многія — упершыню.

«Першае — баявая гатоўнасць дзяжурных падраздзяленняў сіл неадкладнага рэагавання. Гэта новы кампанент, літаральна ў 2016 годзе ўведзены ва Узброеныя сілы. Гэта падраздзяленне, якое мае высокі ўзровень гатоўнасці і абавязана праз нават не гадзіны, а хвіліны пасля сігналу выйсці для вырашэння любых баявых задач, — расказаў Станіслаў Засъ. — Мы праверылі такія падраздзяленні па поўным цыкле (на незнаёмай мясцовасці і на рэальных аб'ектах). Увогуле, з задачамі справіліся».

Другое — гэта разведка. Асаблівая ўвага звярталася на сістэму баявога дзяжурства ў гэтай галіне, падрыхтоўку спецыялістаў, а таксама на якасць «прадукту», які атрымліваецца ў выніку дзяжурства, яго далейшае выкарыстанне.

Паколькі паветраная прастора нашай краіны павінна быць надзейна прыкрыта ў любым становішчы, у кожную праверку Узброеных Сіл уключаюцца пытанні праверкі супрацьпаветранай абароны (СПА). «Усяго было выкарыстана 14 кантрольных цэляў, яны запускаліся з розных напрамкаў на розных вышынях, як правіла, нізкіх, раптоўна для сістэмы СПА, — адзначыў ён. — Ні адна з гэтых кантрольных цэляў не засталася без узаемна. Гэта значыць, у цэлым сістэма працуе і справілася з задачамі. Так, ёсць недахопы і недапрацоўкі ў асобных падраздзяленнях — і сёння ішла пра гэта размова».

Таксама шляхам фарміравання механізаванай брыгады правяралася сістэма адмабілізавання Узброеных Сіл. «Практычна з нуля было сфарміравана злучэнне, прызваныя з запасу каля дзвюх тысяч чалавек, праведзены ўвесь цыкл фарміравання гэтай брыгады і яе баявога зладжвання, — расказаў Станіслаў Засъ. — У далейшым з мэтай праверкі былі праведзены розныя вучэнні».

Так, упершыню быў разгорнуты медыцынскі атрад, ацэненая сістэма медыцынскага забеспячэння ў баявых умовах. На словах дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі, праблема ёсць, і наспела неабходнасць пераглядаць гэтую сістэму. Неабходна абапірацца на густую развітую сетку паліклінік і бальніц, а не разгортваць дзесяці дадатковых шпіталі.

Гаворачы пра ўсплёск у 2017 годзе выяўленых нестатутных узаемаадносін і звязаных з гэтым злачынстваў, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі падкрэсліў, што гэта больш вынікі працы праваахоўных органаў, якія актывізаваліся па даручэнні кіраўніка дзяржавы і вывaрочвалі ўсё навыварат ва Узброеных Сілах; а таксама вынікі работы самога Міністэрства абароны па ўсёй вертыкалі. «Гэта работа будзе працягвацца. Вядома, нестатутныя адносіны ў арміі ёсць, яны прысутнічаюць. І казаць, што мы цяпер ужо ўсё зрабілі для таго, каб іх не было, не даводзіцца. Гэта праца не аднаго дня і нават не аднаго года. Трэба над гэтым працаваць сістэмна і комплексна. І такая праца будзе працягнутая», — дадаў ён.

### КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

На нарадзе некаторых яе ўдзельнікаў прызначылі на новыя воінскія пасады:

Камандуючы войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Аляксандр ВОЛЬФАВІЧ быў прызначаны на пасаду першага намесніка начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл.

Намеснік камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Андрэй ЖУК — на пасаду камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл.

Начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ігар ДЗЕМІДЗЕНКА — на пасаду намесніка камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл.

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны — начальнік упраўлення маральна-псіхалагічнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід КАСІНСКІ — на пасаду памочніка міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## У РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

**Традыцыйна ў суботу ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах пройдуць прамыя тэлефонныя лініі. 2 чэрвеня з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Алег Івавіч ВЯЛІЧКА (80162213121);

Кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ (80212222222);

кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ (80232331237);

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК (80152735644);

кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН (80222501869);

кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ (80175004160);

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ (80172224444).

## З нагоды

# Галоўнае — сям'я

**Сёння — Міжнародны дзень абароны дзяцей, і, акрамя таго, пачынаючы з 2012 года — яшчэ і Сусветны дзень бацькоў. У чым заключаецца абарона нашых дзяцей? Цяпер гэта не проста стварэнне бяспечных умоў для іх і клопат пра здароўе — неабходна таксама даць ім магчымасць мець шчаслівае дзяцінства.**




Абавязковая ўмова для шчасця — магчымасць жыць у сям'і. Апошнім часам у нашай краіне ўдзяляецца асаблівая ўвага сямейным формам уладкавання дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, а таксама дзяцей-сірот.

Так, па словах **галоўнага спецыяліста ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алены СІМАКОВАЙ,** 82 % дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў (гэта 15,7 тысячы), цяпер жывуць у сем'ях. Для гэтага ў Беларусі функцыянуе 283 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. І іх сетка пастаянна расце.

Што датычыцца здароўя і дзіцячай смяротнасці, то яна ў Беларусі адна з самых нізкіх не толькі сярод краін СНД, але і ў Еўропе і Амерыцы. «Мы займаем трэцюю пазіцыю, на тысячу народжаных дзяцей у нас паміраюць у сярэднім тры немаўляці. У той жа Амерыцы — прыкладна 6—7 немаўлят», — кажа **галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Валянціна ВАЎЧОК.**

Але Дзень абароны дзяцей — яшчэ адна падстава нагадаць нам, дарослым, аб неабходнасці берагчы дзяцей. Напрыклад, за чатыры месяцы гэтага года ў Беларусі ўжо 32 дзіцяці загінулі ад знешніх прычын, і адказнасць за гэта ляжыць на дарослых.

**Святлана БУСЬКО**

■ Новая традыцыя



# Супершкола, шоу-балет «Выпускнік-2018» і запрашэнне ў аквапарк

## Як прайшоў рэспубліканскі «Апошні званок»?

**30 мая ў сталіцы быў пабіты тэмпературны рэкорд стагоддзя. Але нават невыносная спёка не змагла сапсаваць свята 10 тысячам выпускнікоў, якія сабраліся ў «Мінск-Арэне» на рэспубліканскае свята «Апошні званок». Да мінчан далучыліся яшчэ 1200 выпускнікоў з рэгіёнаў — па 100 найлепшых з усіх абласцей, а з Мінскай вобласці — 600 хлопцаў і дзяўчат.**

Выключна раз у год на нашых вуліцах можна пабачыць школьную форму савецкіх часоў. Застаецца толькі здзіўляцца, адкуль дзяўчаты яе бяруць і хто яе столькі гадоў захоўвае? Выпускніцы 10-й сярэдняй школы Пінска Вольга Невар і Ганна Кахнюк таксама красуюцца ў карычневых сукенках з белымі фартушкамі. Вольга кажа, што спецыяльна пашыла форму да апошняга званка, а Ганна раздабыла яе праз знаёмых. «Тут усё так пазітыўна, столькі моладзі. Калі рэспубліканскі апошні званок стане традыцыяй, будзе проста выдатна. Вось толькі шкада, што давялося прапусціць свой школьны званок апошні: дарога да сталіцы няблізкая, — канстатуюць дзяўчаты. — Але з нашага горада на свята трапілі ўсяго 10 чалавек, і мы — сярод шчаслівўчыкаў...»

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА,** які наведаў рэспубліканскі «Апошні званок», выказаў упэўненасць, што большасць выпускнікоў цвёрда ведаюць, куды яны будуць паступаць. Для яго апошні школьны званок празвінеў у далёкім 1981 годзе. «Я заканчваў у Полацку сярэднюю школу № 14. У мяне была канкрэтная мэта — паступіць у педагагічны інстытут на гістарычны факультэт, якую я і ажыццявіў. Цудоўна памятаю той майскі дзень, апошні званок і свой выпускны вечар. Школа — гэта незабыўная ўражанні. Мы па сёння падтрымліваем стасункі з аднакласнікамі, рэгулярна збіраемся на юбілейныя даты».

Міністр параіў будучым выпускнікам удзяляць увагу ўсім прадметам аднолькава, незалежна ад таго, якую спецыяльнасць яны абралі, таму што ў агульнаадукацыйнай школе фарміруецца ўсебакова развітая асоба. «Увогуле, жыццё іх будзе яшчэ неадноўчы экзаменаваць, і, я спадзяюся, яны ўсе выпрабаванні вытрымаюць з годнасцю», — сказаў Ігар Карпенка.





Адкрываючы ўрачыстую частку свята, **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль ЖАРКО** зачытаў прывітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў адрас выпускнікоў.

«Зараз думкі і мары кожнага з вас накіраваныя ў будучыню. Якой яна будзе, шмат у чым залежыць ад выбару прафесійных шляхоў і рэалізацыі свайго прызвання, — гаворыцца ў ім. — Куды б ні вывеў гэты пошук, памятайце: вы патрэбныя сваёй Радзіме. Многае зроблена, каб тут, на роднай зямлі, вы маглі развіць свае таленты, дамагчыся поспеху, адчуць сябе па-сапраўднаму шчаслівымі і ўпэўненымі ў заўтрашнім дні. Але аўтарамі ўласнага лёсу застаецеся вы. Стараннасць і працавітасць — вось пропускі ў паспяховае жыццё».

А далей адбылося ўшанаванне выпускнікоў у розных намінацыях. Узнагароды ў намінацыі «Талент-2018» выпускнікам уручаў Аляксандр Саладуха. Алімпійскі чэмпіён Аляксандр Багдановіч адзначыў самых спартыўных і моцных духам у намінацыі «Чэмпіён». Былі вызначаны найлепшыя ў катэгорыях «Інтэлект» і «Лідар-2018». «Хвіліна славы» была таксама і ў педагогаў. Міністр адукацыі Ігар Карпенка ўручыў падзякі найлепшым класным кіраўнікам ад кожнай вобласці і Мінска. Акрамя таго, усе пераможцы ў гэтай намінацыі атрымалі па 10 білетаў у аквапарк для навучэнцаў свайго класа. З'явіліся і першыя ўладальнікі тытула «Супершкола». Яго будуць насіць сярэдняя школа № 7 г. Баранавічы, сярэдняя школа № 31 г. Віцебска, гімназія № 1 г. Гродна, Дзераўнянская сярэдняя школа Стаўбцоўскага раёна, сталічная гімназія № 1 імя Ф. Скарыны, Мазырскі дзяржаўны абласны ліцэй і Кадзінская сярэдняя школа Магілёўскага раёна. Міністр адукацыі ўручыў кіраўнікам гэтых устаноў таксама сертыфікаты на дзве актыўныя сэнсарныя сістэмы (мультыборды).

Ну а самай вясёлай і доўгачаканай атрымалася заключная частка свята, падчас якой перад выпускнікамі выступілі ТЕО і Вольга Рыжыкава, групы «NaviBand» і «Тяни-Толкай», дзядька Ваня са сваім музычным калектывам, Саша Нэма, Герман, Алена Ланская, Георгій Калдун і іншыя. А выход Аляксандра Саладухі на сцэну ў адну секунду разбіў увесь скепсіс у інтэрнэце і сацыяльных сетках наконт прысутнасці спевака на маладзёжным свяце. Напрыканцы свайго выступлення пажадаў выпускнікам знайсці сваё месца пад сонцам у гэтым жыцці, і свята прадоўжылася...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

**Больш фота шукайце на сайце www.zviazda.by**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ШАС ПАПЯРЭДЗІЛІ ПРА ПАГРОЗУ АБ'ЯДНАННЯ ІД І «АЛЬ-КАІДЫ»



Тэрарыстычныя групоўкі «Ісламская дзяржава» і «Аль-Каіда» могуць аб'яднацца, заявіў дырэктар выканаўчага камітэта рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) Яўген Сысоеў на антытэрарыстычным форуме ў Краснаярску. Паводле яго слоў, у Афганістане сканцэнтравана вялікая колькасць баевікоў, якія раней ваявалі на Блізкім Усходзе. Усе яны гатовыя працягваць сваю дзейнасць. Сёння ІД рыхтуе і перакідвае групы ў Еўропу, Цэнтральную і Паўднёва-Усходнюю Азію, Расію. Як адзначыў Сысоеў, яны часта практыкуюць тактыку выпадковага выбару мэтаў нападаў у буйных мегаполісах з выкарыстаннем любых падручных сродкаў, халоднай зброі, транспарту. Таксама прыхільнікі тэрарыстаў праходзяць анлайн-навучанне. Паводле інфармацыі Сысоева, летась ва ўсім свеце тэрарыстамі забіта і паранена больш за 33 тысячы чалавек. Усяго з 2014 года пацярпела 152 тысячы. У сярэднім штогод адбываецца больш за 1600 тэрактаў.

## ЗА НАЗАРБАЕВЫМ ЗАМАЦАВАЛІ ПРАВА ПАЖЫЦЦЁВА ЎЗНАЧАЛЬВАЦЬ САВЕТ БЯСПЕКІ КАЗАХСТАНА

Сенат Казахстана ўхваліў законапраект аб Савеце бяспекі, які, у прыватнасці, замацоўвае права за дзейным прэзідэнтам Нурсултанам Назарбаевым пажыццёва ўзначальваць Савет бяспекі, перадае РІА Навіны. Акрамя гэтага, законапраект надзяляе Савет бяспекі статусам канстытуцыйнага органа, які каардынуе правядзенне адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці ў мэтах захавання унутрыпалітычнай стабільнасці, абароны канстытуцыйнага ладу, дзяржаўнай незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці і нацыянальных інтарэсаў Казахстана на міжнароднай арэне. Склад Савета бяспекі прапануецца фарміраваць прэзідэнтам па ўзгадненні са старшынёй Савета бяспекі.

## МЕРКЕЛЬ ПРЫЗНАЛАСЯ, ШТО ЗАСТАЛАСЯ КАНЦЛЕРАМ З-ЗА ТРАМПА

Канцлер Германіі Ангела Меркель у гутарцы з колішнім прэзідэнтам ЗША Баракам Абамам распавяла, што пайсці на чацвёрты тэрмін на пасадзе канцлера ФРГ яна была вымушаная, каб процідзейнічаць Дональду Трампу пасля яго абрання. Пра гэта паведаміў саветнік Абамы па нацыянальнай бяспецы Бэн Род у сваёй кнізе «Свет як ён ёсць», перадаюць «Весткі». Вытрымкі з кнігі апублікавала The New York Times. Так, напрыклад, у сваіх мемуарах Родс піша, што падчас апошняй сустрэчы Меркель і Абамы канцлер развітвалася з ім са слязамі. «Яна зусім адна», — прыводзіць аўтар кнігі словы Барака Абамы.

## ДАЦКІ ПАРЛАМЕНТ ПРАГАЛАСАВАЎ ЗА ЗАБАРОНУ НАШЭННЯ НІКАБАЎ



Парламент Даніі адобрыў прапанову ўрада забараніць нашэнне ў грамадскіх месцах галаўных убораў, якія закрываюць твар. Пра гэта паведамляе Радыё Даніі DR. Забарона набудзе моц 1 жніўня гэтага года. У якасці прыкладаў адпаведных галаўных убораў называюцца, у прыватнасці, нікаб, пакрыва «бурка», а таксама шапкі-маскі «балаклавы», якія пакідаюць адкрытымі толькі вочы і рот. Парушэнне забароны першы раз прапануецца караць штрафам на суму ў адну тысячу дацкіх крон (157 долараў), максімальны штраф можа быць да 10 тысяч крон (1568 долараў) пры паўторным парушэнні.

■ Надвор'е

# Плюс 30 і нават вышэй

## У панядзелак нават уначы будзе аж да 17 цяпла

**У першыя дні лета па паўночным усходзе краіны спякота крыху спадзе, а ў ноч на пятніцу ў асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей былі нават слабыя замаразкі, але днём паветра зараз хутка прагравaецца. У выхадныя чакаецца па-летняму цёплае, пераважна без ападкаў, надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.**

Заўтра будзе амаль без ападкаў. Толькі ў крайніх паўднёва-заходніх раёнах краіны магчымыя кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 градусаў па крайнім паўднёвым усходзе да плюс 14 па захадзе краіны. Днём — ад плюс 23 да плюс 28 градусаў. У нядзелю на тэрыторыю краіны працягне паступаць цёплая паветраная маса з поўдня Еўропы пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—15 цяпла, удзень — да плюс 24—30 градусаў.

У панядзелак захаваецца вельмі цёплае надвор'е, але месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—17 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе 24—29 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да плюс 31 градуса.

Як паведамілі рэдакцыі кліматолагі Белгідрамета, май сёлета выдаўся вельмі цёплы. У цэлым за месяц тэмпературны фон па краіне на 3—4 градусы перавысіў кліматычную норму і адпавядаў чэрвеньскім паказчыкам. Дажджоў у маі было вельмі мала, амаль паўсюдна адзначаецца недабор ападкаў, у асобных раёнах краіны выпала менш за трацiну нормы.

**Сяргей КУРКАЧ**

# А вам дадуць крэдыт?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але, як і раней, глядзець будуць не толькі на зарплату. Адмовіць у крэдыце могуць і па іншых умовах. Плацежаздольнасць кліента вызначаецца па цэлым наборы параметраў. Перш за ўсё гэта памер даходу кліента, наяўнасць дзейных крэдытаў, не менш за тры (шэсць) месяцаў (чым больш, тым лепш) працоўнага стажу на апошнім месцы працы. Фінансавая ўстанова таксама абавязкова пераканаецца ў адсутнасці пратэрмінаванай запазычанасці па раней выдадзеных крэдытах. Яе банкі ўбачаць пры звароце ў бюро крэдытных гісторый.

Дапусцім, крэдытная гісторыя ў вас добрая і наогул з фармальнымі прыкметамі ўсё нармальна, што тады? У гэтым выпадку даныя кліента пачынае аналізаваць скорынгавая сістэма. Гэта праграма, якая па спецыяльных алгарытмах ацэніць наяўныя звесткі пра крэдытаатрымальнікаў. Яна таксама ўлічвае назапашаную ў банка статыстыку па праблемнай запазычанасці і можа з пэўнай доляй верагоднасці спрагназаваць надзейнасць кліента.

Дарэчы, ужо цяпер банкаўскія спецыялісты на аснове сваёй інфармацыі склалі партрэт тыповага крэдытаатрымальніка. Гэта жанчына сярэдніх гадоў, якая жыве ў горадзе і працуе на адным месцы не менш за тры гады. Але гаворка ў дадзеным выпадку пра спажывецкія крэдыты. З аўтамабілямі, напрыклад, сітуацыя іншая — тыповы атрымальнік такога крэдыту ўжо мужчына ва ўзросце да 50 гадоў.

## МІНІМАЛЬНЫ ПАМЕР ДАДУЦЬ БЕЗ ДАВЕДКІ АБ ДАХОДАХ

Новая інструкцыя аб выдачы крэдытаў падыходзіць выбарачна і да гэтага пытання. На думку **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый нацыянальнага банка Вольгі ІЛЮКЕВІЧ,** уведзены каэфіцыент пазыковай нагрузкі не азначае, што без даведкі аб зарплаце цяпер не варта нават падыходзіць да банка.

«Новаўвядзенні рэгулятара даведак аб даходах не датычацца, — тлумачыць спецыяліст. — Банкі самастойна вырашаюць, калі яе ў кліента папрасіць, а калі можна выдаць крэдыт без даведкі. Пацвярджэнне даходаў не спатрэбіцца, калі сума крэдыту невялікая». Напрыклад, у большасці сістэмных банкаў краіны пры звароце па крэдыт да 1500 рублёў дакументы аб зарплаце не спатрэбяцца.

Дарэчы, калі крэдыт вы хочаце аформіць у тым банку, у якім аформленая ваша зарплатная картка, сума крэдыту без даведкі можа быць вышэйшай, чым для «чужога» кліента.

## ДЫК КОЛЬКІ Ж ТРЭБА ЗАРАБЛЯЦЬ?

Каэфіцыент пазыковай нагрузкі на практыцы аказаўся даволі гнуткім. У некаторых выпадках на крэдыт не варта разлічваць, нават калі на яго пагашэнне будзе сыходзіць чвэрць вашай зарплаты. Дапусцім, вы хочаце пазычыць 2500 рублёў на пяць гадоў. Як падлічылі спецыялісты аднаго камерцыйнага банка, зарабляць у гэтым выпадку трэба не менш за 300 рублёў. Такой сумы будзе дастаткова, толькі калі ў вас няма іншых крэдытаў, а таксама ўтрыманцаў (напрыклад, непаўналетніх дзяцей). Плацяж пры гэтым прыйдзецца крыху больш за 60 рублёў у месяц — гэта ўсяго толькі каля 20 % ад даходу. Як бачым, такі крэдыт могуць не даць, нават калі плацяжы па ім будуць складаць усяго 30 % ад прыбытку, а пры 40 %, прапісаных у новых правілах рэгулятара, наогул размовы ў банку не атрымаецца.

Калі ў вас даход атрымліваецца меншы за 300 рублёў, то з якіх грошай вы збіраецеся аддаваць доўг і яшчэ нармальна жыць? Вам, натуральна, адмовяць у большым крэдыце. І будуць дзесьці мець рацыю.

## З ЗАРОБКАМ ДА ТЫСЯЧЫ — ІНШАЕ ПЫТАННЕ

Зусім іншая размова ў банкіраў з кліентамі, у якіх пастаянная праца і салідная (па цяперашніх мерках) зарплата. Што, калі плацеж па крэдыце займае 41 працэнт ад іх зарплаты, дакладна яго не дадуць?

Тут не ўсё так адназначна. Калі падыходзіць да пытання з пункту гледжання матэматыкі, атрымліваецца, што гараджанін з сярэднім заробкам (а гэта каля 930 рублёў) можа пазычыць у банка максімум 15 тысяч рублёў. Штомесячны плацеж складзе пры гэтым каля 370 рублёў. Але гэта не значыць, што банк не дасць такому кліенту, напрыклад, 16 тысяч рублёў. Асабліва ўлічваючы, што крэдытаатрымальнік з'яўляецца кліентам банка (атрымлівае па картцы зарплату), а крэдытная гісторыя яго ідэальная.

Як растлумачылі ў Нацыянальным банку, фінансавыя структуры па-ранейшаму змогуць выдаваць крэдыты, плацяжы па якіх будуць большыя за 40 % ад даходу кліента ў месяц. Галоўная ўмова — каб такія спажывецкія крэдыты не перавышалі 10 % ад усяго партфеля спажывецкіх крэдытаў банка. Словам, у кожным канкрэтным выпадку банк будзе ўлічваць мноства абставін.

## МОЖНА НАВАТ ДВА, ГАЛОЎНАЕ — ЯКІХ

Ва ўсіх маіх знаёмых апошнім часам узнікае практычна адно галоўнае пытанне: калі ўжо ўзяў крэдыт на кватэру, то на просты спажывецкі разлічваць не варта?

Аказваецца, далёка не так. Як і ў выпадку са спажывецкімі крэдытамі, банкі змогуць дзейнічаць гнутка. Сумы крэдыту на нерухомасць па новых правілах не павінны перавышаць 90 % ад кошту набытага жылля. Але і гэта далёка не канчатковае рашэнне. І тут можна ўгаварыць банк даць вам больш. Галоўнае, каб крэдыты з перавышэннем гэтага параметра не перавышалі 10 % ад агульнага крэдытнага пакета банка на нерухомасць. Так што добрым кліентам банк адназначна пойдзе на сустрэчу і пазычыць патрэбную суму.

А два крэдыты на спажывецкія патрэбы вам сапраўды не дадуць. У тым выпадку, калі першы крэдыт разлічаны на максімальную суму.

## У ЧЫМ СОЛЬ НОВАЙ ІНСТРУКЦЫІ

Асноўная мэта абмежаванняў, якія ўводзяцца, — пазбегнуць рызык праз залішнія апетыты крэдытаатрымальнікаў. Новаўвядзенні абароняць многіх атрымальнікаў ад самих сябе, іх схільнасці да неапраўданай рызыкі, лічыць Вольга Ілюкевіч. Новыя правілы таксама абароняць і банкі.

Адной з ключавых змен у сферы рознічнага крэдытавання, накіраванай на забеспячэнне абароны правоў спажыўцоў банкаўскіх паслуг, з'яўляецца ўвядзенне ўніфікаванай для ўсіх банкаў формы інфармацыі аб умовах крэдытавання. Важна адзначыць, што банкі абавязаны праінфармаваць кліента аб бясплатным спосабе вяртання крэдыту, а таксама аб наяўнасці паслуг, што аказваюцца банкам або трэцімі асобамі за асобную плату і якія з'яўляюцца абавязковымі для заключэння крэдытнага дагавора.

Форма інфармацыі аб умовах крэдытавання павінна ўключаць звесткі пра суму крэдыту, памеры працэнтаў, тэрміны і парадак атрымання і вяртання крэдыту, магчымасці і ўмовы датэрміновага вяртання крэдыту. Інфармацыя павінна быць аформлена ў выглядзе табліцы шрыфтам вызначанага выгляду (Times New Roman) памерам не менш за 12 пунктаў і не павінна перавышаць аднаго ліста. Аналагічныя патрабаванні па ўжыванні шрыфту ўстаноўлены інструкцыяй і для афармлення крэдытнага дагавора. Пры згодзе патэнцыйнага крэдытаатрымальніка з усімі ўмовамі і падпісанні інфармацыі аб умовах крэдытавання названыя ўмовы павінны быць адлюстраваны ў крэдытным дагаворы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Працягніце думку: «Я паркуюся, як ...»

## Папярэджваць ці эвакуіраваць

Падобныя рэйды — частка экалагічнай акцыі «Я паркуюся, як ...», галоўная мэта якой выявіць машыны, пакінутыя на газоне. Арганізатарам акцыі выступае Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, які падтрымліваюць прадстаўнікі раённай адміністрацыі, камунальнай гаспадаркі і супрацоўнікі ДАІ.



У адзін з майскіх вечароў мы адпраўляемся з імі ў двор вялізнага дома па вуліцы Мірашнічэнка. Гэты адрас быў абраны нездарма: мясцовыя жыхары самі паскардзіліся на незаконапаслухмяных суседзяў. Супрацоўнікі камітэта ўжо пабывалі тут некалькімі днямі раней і пакінулі пад «дворнікамі» машын папярэджанне. Але, мяркуючы па тым, якая карціна адкрываецца нашым вачам, гэта не надта падзейнічала.

Час набліжаецца да шасці гадзін вечара, і, абышоўшы дом па перыметры, мы заўважылі не менш за 20 машын, прыпаркаваных на «зялёных». Дакладней, там, дзе раней была зялёная зона. Цяпер жа гэта ў большасці выпадкаў проста голая зямля, на якой не ў стане выжыць ні адна травінка. Пры гэтым прыцягнуць кагосьці да адказнасці менавіта за пашкоджанне зялёнай зоны вельмі складана.

— Калі машына ўжо стаіць на газоне, мы не зможам даказаць, што менавіта яна стала прычынай пашкоджанняў. Гэта можна ўстанавіць, калі кіроўца будзе парквацца на нашых вачах, але менавіта туды, дзе яшчэ захаваўся параснік травы. Ці ж падчас вільготнага надвор'я ён будзе выязджаць з паркоўкі і на зямлі застанецца бачны малюнак пратэктара, які пры гэтым павінен выразна сведчыць аб прычыненні шкоды. У абодвух выпадках парушальнік атрымае штраф у памеры да 50 базавых велічынь. Але такія выпадкі даволі рэдкія. Затое на такога аўтамабіліста ў поўным праве скласці пратакол за няправільную паркоўку і стаянку транспарту супрацоўнікі ДАІ, — патлумачыла **намеснік начальніка аддзела аператыўнага кантролю па Заводскім, Кастрычніцкім, Савецкім раёнах Мінгаркампрыроды Настасся ПРАКАПОВІЧ.**

## Мы ж усяго раз!

Для таго каб пагрозы не былі галаслоўнымі, разам з намі на акцыі прысутнічае **інспектар ДПС АДАІ Савецкага РУУС маёр міліцыі Алег ФУРС** і дасведчаныя машыністы эвакуатара. Уважліва вывучыўшы ўсе машыны, якія парушаюць правілы паркоўкі, спыняем свой выбар на чырвоным «Фордзе». Гэты прыклад выглядае найбольш абуральна: машына стаіць на маладой траўцы, на мінімальнай адлегласці ад ствала бярозы. Нягледзячы на тое, што, нібы прадбачачы такі паварот падзей, кіроўца прыпаркаваў машыну ў максімальна нязручным для эвакуатара месцы, дасведчаныя работнікі з лёгкасцю спраўляюцца з яе перасоўваннем.

Аўтамабіль адпраўляецца на штрафстаянку, а яго ўладальніка чакае непрыемны сюрпрыз — штраф за эвакуацыю ў памеры 91,5 рубля, а таксама сем рублёў за кожны наступны дзень знаходжання машыны на платнай стаянцы.

Нядзіўна, што з'яўленне эвакуатара выклікае ў двары сапраўдны перапалох.

— А на лабавым шкле тэлефона не было? Хоць бы набралі, — бядуе маладая мама. — У нас нядаўна такі ж выпадак быў. Мы большую частку года жывём за мяжой, а тут вярнуліся дадому, якраз да свята — дня нараджэння дзіцяці. Месцаў у двары не было, таму мы, усе ў клопатах, вырашылі пакінуць машыну на тратуары — з самай раніцы збіраліся прыбраць. А тут прачынаемся, а машыны ўжо няма. І так крыўдна стала, што ніхто з суседзяў не папярэдзіў. Мы ж усяго раз!

А дзе тратуар, там і газон... Як расказала **старшы майстар ЖЭУ-3 Вольга ВАЛЕНЦЮКЕВІЧ,** каб абараніць навакольны свет ад самих сябе, у дварах дамоў пачалі ўсталёўваць каменныя паўсферы і металічныя агароджы. Меру можна назваць эфектыўнай, калі б не адно «але». Нягледзячы на тое, што гэта нятаннае задавальненне, ужо не аднойчы спецыялісту даводзілася сутыкацца з тым, што падобныя абмежавальнікі выдзіраюць з коранем, абы не пазбаўляцца запаветных некалькіх метраў паркінга.

## Аб каменных джунглях

Мужчыны, якія таксама зацікавіліся тым, што адбываецца ў іх двары, паводзяць сябе не так эмацыянальна, па меншай меры не выкладаюць сваю біяграфію ў дзве першыя хвіліны знаёмства. Наадварот, значна больш іх цікавіць, што за «чужынцы» парушылі спакой ціхай мінскай ускраіны. Некаторыя нават просяць паказаць дакументы, але на ахвотнае жаданне гэта зрабіць адразу неяк губляюць імпэт.

— Ну, вы зразумейце нас таксама. Дзе ставіць машыны? Вось вы прыйшлі на адзін дзень, а праблема засталася, — разводзіць рукамі мясцовы жыхар. — І наогул, чаму менавіта мы? Вам дварой у Мінску мала?

На інфармацыю пра тое, што паскардзіўся хтосьці з суседзяў, рэагуе з недаверам. Шматзначна абводзіць позіркам усе паверхі, быццам бы спрабуючы зразумець: хто? Трохі падумаўшы, нібы знаходзіць рашэнне:

— Слухайце, давайце будзем аб'ектыўнымі: які ж гэта газон? Так, зямля. Ды і наогул, з гэтага боку дома ніхто ніколі не гуляе. Дзіцячыя пляцоўкі знаходзяцца з другога боку. Ну, каму тут могуць перашкодзіць машыны?

Аднак правілы аднолькавыя для ўсіх. Хочаш пазбегнуць пастаяннага падсвядомага страху — дзейнічай па законе. Для гэтага неабходна абмеркаваць магчымасць перарабкі раз'езджанага газона і даўно закінутай дзіцячай пляцоўкі ў дадатковыя паркоўвачныя месцы з іншымі жыхарамі дома. Калі большасць будзе «за», можна звярнуцца ў раённае КУП «ЖКГ». І, калі і знойдуцца неабходныя сродкі, будзе распрацаваны праект добраўпарадкавання дваровай тэрыторыі. Такія прыклады ўжо былі ў Мінску, але, на жаль, часцей за ўсё план спыняецца на этапе прывядзення ідэі да адной роўніцы. Такое жыццё, што камусьці абавязкова будуць патрэбныя тыя самыя тры травінкі пад вокнамі. Хоць, з іншага боку, калі да іх не прыслухоўвацца, праз нейкі час можна апынуцца ў цалкам каменных джунглях.

Калі мы ўжо збіраемся сыходзіць, нас гукае жанчына: «Пачакайце! Пачакайце! А як доўга працягнецца акцыя? Калі нам ужо можна выдыхнуць спакойна?»

**Дар'я КАСКО.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




## ЗУБ ЗА ЗУБ... А НА ДАБРО — ДАБРОМ

Да слова «дэфіцыт» сучаснае пакаленне, можна сказаць, глухое, бо цяпер у дэфіцыце хіба што грошы. Калі яны ў чалавека ёсць, значыць, «жыццё ўдалося»: купляй што хочаш, і тавар табе (калі верыць рэкламе) мала што прывязуць (хутка і бясплатна), дык яшчэ і падарунак пакінуць... Карацей, усё як у адной радзільні: маўляў, калі вы тут народзіце двайню, то трэцяе немаўлятка вам дадуць задарма.

А некалі ж дэфіцыт быў амаль на ўсё, у тым ліку — на лекі. Тацяна, мая знаёмая, на ўласнай скуры гэта адчула.

Значыць, забалелі ёй неяк зубы, пайшла на прыём да доктара. Той уважліва ўсё агледзеў і прызнаў, што «чацвёрку» з «пяцёркай» трэба выдаляць, прычым тэрмінова.

Трэба — значыць трэба: доктар зрабіў адпаведны ўкол ды выправіў пацыентку ў калідор — чакаць, пакуль дзясна «замарозіцца».

Тацяна паслухмяна сядзіць — і дзесяць хвілін, і пятнаццаць — побач з такімі ж гаротнікамі... Толку ад уколу ніякага, а медсястра тым часам ужо ў кабінет заве.

— Можа, мне яшчэ крыху пачакаць? — просіцца пацыентка.

— Чаго? З мора пагоды? — пытае памочніца эскулапа. — Гэта вы ўжо дома будзеце.

І вось жанчына ў крэсле. Стаматолаг стукае малаточкам па абранай «пяцёрцы», пытае:

— Адчуваеце?.. Вам баліць?

— Угу, — ківае ў адказ кабета.

— Нічога, зараз вырвем і пройдзе, — супакойвае лекар.

Падчапіў ён зуб — у Тані аж іскры з вачэй! Пацягнуў... І жанчына следам.

— Ды сядзіце ж вы! — загадваюць ёй, — трымайцеся за што-небудзь.

«Пад правай рукой, — Тацццяна расказвала, — я адразу ж падлакотнік знайшла. І злева хацела, а там — порткі доктара, яго ногі... А боль... Тады я за іх! Ён — за зуб і... Усё, хвала Госпаду!.. «Жывадзёры, — кажу замест дзякуй, выціраючы слёзы. — Застрэліць мала».

— У вас няма з чаго, — пасміхаецца доктар.

— Затое ёсць чым! — прамовіла ў адказ Тацццяна.

...А працавала яна, трэба сказаць, у краме «Паляўнічы і рыбалоў» — стрэльбамі не гандлявала, але ж патроны ў продажы амаль заўсёды былі.

— І вось недзе праз тыдзень пасля гэтай «экзекуцыі», — расказвала жанчына, — стаю я за прылаўкам, нешта кажу чарговаму пакупніку і адчуваю чыйсьці ўпарты позірк. Падымаю вочы, — той стаматолаг! Я ад здзіўлення аж рот адкрыла... І ён, відаць, не чакаў мяне ўбачыць. Але ж пазнаў і, не паверыце, уцёк на ўсякі выпадак!..

Я да яго сама праз тыдзень прыйшла — трэба ж яшчэ адзін зуб выдаляць. Села ў знаёмае крэсла, чую: «Падрыхтуйце патрэбную дозу», — загадвае доктар той самай медсястры і называе нейкія лекі. «Але іх зусім мала», — амаль шэптам заўважае памочніца. «Рабіце, што кажу», — можа, успомніўшы, што ў мяне патроны ёсць, а мо і нешта іншае, настойвае стаматолаг і... Праз некалькі хвілін пасля ўколу я ўжо адчуваю эфект прэпарату (папярэднім разам іх, відаць, разбаўлялі ці проста эканомілі), потым, яшчэ крыху пачакаўшы, доктар «чапляе» мой зуб і выдаляе яго амаль без болю!

Вось так, — заключыла Тацццяна, — у мяне з'явіўся знаёмы лекар, а ў яго (дарэчы, заўзятага паляўнічага) — блат у нашай краме.

Што зробіш, на гэтым — ты мне, я табе — тады шмат што трымалася. Як цяпер — на грашах.

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## КОЛАСАЎ «ПАЧАСТУНАК»

Сярод маіх аднакурснікаў па БДУ, а дакладней па беларуска-рускім аддзяленні філфака, значыўся сын таго самага «Юзіка-шаляніцы» з коласаўскай «Новай зямлі», Віктар Міцкевіч. Але ж ён гэтым сваяцтвам зусім не выхваляўся. Сціплы быў хлопец, даступны, адкрыты, з гумарам. Сядзіць, бывала, на лекцыі, канспект вядзе і ў той жа час нешта ў нататнік заносіць. «Вершы?» — пытаюся. — «Ну, — усміхаецца, — працяг «Новай зямлі»».

Карацей, не без здольнасцяў быў і вучыўся добра: залікі, экзамены — усё здаваў паспяхова. Але ж аднойчы і ад яго фартуна адвярнулася: атрымаў пасрэдную адзнаку, на цэлы семестр застаўся без стыпендыі. І добра б з дому нешта перападала, а то...

Марнее, бачым, хлапец, перабіваецца з хлеба на ваду. Гледзячы на гэта, нехта з нашых сказаў: «Слухай, браце, а чаму б табе да дзядзькі не схадзіць, да Якуба Коласа. Ён жа, відаць, чалавек грашавіты. І не чужы табе». — «Сумленне не дазваляе, — прызнаўся Віктар. — Сорамна перад дзядзькам».

Але ж і голад яму не цётка: прымусіў ён хлопца пайсці на паклон.

Мы ў інтэрнаце засталіся чакаць, з чым жа вернецца.

Бачым, і гадзіна прайшла, і дзве... Урэшце Віктар з'яўляецца. Мы да яго: «Ну як?». А той толькі рукой махнуў: лепш, маўляў, не пытайцеся: уляцела — ого-го! Лайдаком мяне абазваў, расказаў, як самому было, як у людзі выходзіў. Але і адпусціўся... Накарміў — ад пуза, дзвесце рублёў мне даў, ладны кавалак сала, сказаў, каб вучыўся і... заходзіў яшчэ.

Пачуўшы гэта, мы ад душы пасмяяліся, а потым, мусіць, кожны падумаў, што неяк інакш наш Колас паступіць і не мог.

**Віктар Несцяровіч,**
*г. Лагойск.*

## МАЎЧЫ... ЗА РАЗУМНАГА СЫДЗЕШ

...Не, яно нездарма людзі кажуць: хто не быў маладым, той не быў дурны. І дур гэты ў кожнага свой. Я, напрыклад, нічога дрэннага ніколі не рабіла. Нават па садах не лазіла — у адрозненне ад іншых дзяцей... Хіба што прастадушнай была, залішне даверлівай. З гадамі, праўда, паразумнела, але ж не настолькі, як хацелася б, бо па цяперашнім часе разумным лічыцца той, хто хітры, а шчыры — дык ужо і прыдуркаваты, яму жывецца цяжэй. Зрэшты, мяркуйце самі.

Скончыла я, значыць, школу, атрымала прафесію — на свой хлеб пайшла. Ды што там — да старшага бухгалтара даслужылася.

(Тут анекдот дарэчы. Маленькі Ізя неяк пытаецца: «Дзядуля, а Карл Маркс быў кім?» — «Эканамістам, унучак». — «Як наша цёця Песя?» — «Не, ну што ты... Наша цёця Песя — старшы эканаміст!»)

Вось і я была ўжо старшым.

А сэнс нашай працы ў чым? Думаеце, зрабіць улік усіх вытворчых працэсаў? Ці падвесці вынікі? Не: у верхнія інстанцыі справаздачу здаць. І паказаць у ёй баланс не столькі паміж прыходам і расходам, колькі тым, што ёсць (рэальна, на самай справе), і тым, што патрабуе начальства. Вызавуць яго ў раён, спусцяць нейкую «дырэктыву», — працэс пасля яе пайшоў ці не пайшоў, а вынік бухгалтэрыя дай. І не абы які, а з выкананнем, перавыкананнем і нават апераджальнымі тэмпамі...

У раёне ад нас іх чакаў найперш Сазонавіч. Сам па сабе спецыяліст ён моцны, але ж кіраваць яму найцяжэй было, бо сярод бухгалтараў, як вядома, адны жанчыны. Значыць, голас на іх не павысь, мацюка не загні, словаў «каза» і «аўца» тады не было. Атрымліваецца, што Сазонавіч усяго і мог, што стукнуць кулаком па стале, аддаць справаздачу «ўзад» на дапрацоўку ды (калі ўжо зусім не даходзіць) дурніцамі абазваць.

І тое, і другое, і трэцяе страшней за вайну было (для тых, хто яе не бачыў)... А таму, — падумала я, — трэба неяк ад начальства падалей.

Гэта называецца — чалавек мяркуе.

А начальніца мая, галоўная бухгалтарка, неяк пытаецца:

— У горад хочаш?..

—?! (Ну яшчэ б...)

— ...Тады справаздачу завязеш. Здасі Сазонавічу.

— ?!

— Не бойся, ён дзевак любіць: на цябе крычаць не павінен.

«А калі і пакрычыць, — у дарозе ўжо думаю я, — то неяк сцярплю... Затое потым па крамах пабегаю — у кожныя дзверы. Можа, дзе на імпарт нарвуся».

У прадчуванні гэтага іду ў кабінет. Самога, бачу, у крэсле няма.

— І сёння ўжо не будзе, — кажа нейкая сумная цётка.

(Сазонавіч — я ўжо ведала — на прыём справаздач бухгалтарак запрашаў з найбліжэйшых гаспадарак).

— А як жа мае паперы? — пытаюся ў жанчыны, прымаючы яе за калегу.

— Можаце мне аддаць.

— Праўда?! — не паверыла шчасцю я. — Вось гэта лафа!.. А мне казалі, што Сазонавіч кроў па кропельцы вып'е, пакуль справаздачу прыме, што яму сам чорт не дагодзіць і раптам... Дзякуй вам!

Цётка ў адказ чамусьці маўчала — нават вачэй не ўзняла.

Ну дык я і ходу — з думкай, што і ў крамах пашчасціць...

Выйшла на Ленін-авеню (гэта цэнтральная вуліца, раней Старабыхаўскай звалі) — зазірнула ва ўсе дзверы там. На дэфіцыт, на жаль, не нарвалася — без пакупак паехала дамоў, пабегла ж у кантору і давай хваліцца там сваёю ўдачай ды шчырай размовай з цёткай.

— Яна ў хустачцы была? Стол ад начальніка справа? — удакладнілі канторскія.

— У хустачцы... Справа...

— Дык хто ж цябе за язык цягнуў? Дурніца! — засмяяліся калянжанкі. — Гэта ж ягоная жонка!

Я знячэўку і села!

...Дзіва ці не, але пасля гэтага ніякіх рэпрэсій не было. Можа, «падзяку» маю цётка тая міма вушэй прапусціла, можа, пакінула сабе — мужу не данесла.

А ён (гэта я з часам убачыла) — зусім і не монстр быў: «людзей не еў», мог нават пажартаваць...

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

### Неасабісты суб'ектыў

# НЕАДКЛАДНАЯ СПРАВА



Па словах Яніны Вацлаваўны, раней амаль усе жанчыны ўмелі ткаць. Ужо з 14 гадоў дзяўчына рыхтавала сабе пасаг. А на вяселлі павінна была кожнаму госцю падараваць пояс, які выткала сама. Гэта традыцыя, на жаль, не захавалася. Дарэчы, у пост ткачыхі не працуюць. Раней у гэты перыяд нельга было закладаць аснову з нітак. Пасля Вялікадня, напрыклад, пачыналі ткаць толькі праз 10 дзён. Цяпер у ваўкавыскіх ткалляў самыя напружаныя дні, бо трэба паспець да летніх фестываляў у Гродне і Віцебску.

— У нас ёсць заказы і ад мясцовых жыхароў, — кажа Яніна Ізольская. — Многія просяць выткаць палавікі ў традыцыйнай ваўкавыскай гаме: гэта спакойны, прыглушаны колер. Але ёсць і заказы на яркія вырабы, напрыклад для дзіцячых пакояў. Дзіця поўзае па ім і разглядае яркія палоскі. Попыт расце, бо гэта натуральны выраб на льняной аснове. На агрысядзібы купляюць.

Ткацкія традыцыі адначляюцца амаль па ўсіх раёнах Гродзеншчыны. Сёлета статус гісторыка-культурнай каштоўнасці прысвоены традыцыйнаму белаўзорыстаму ткацтву горада Ліды. Тут вырабляюць унікальныя ручнікі. Многа заказаў паступае ад народных і аматарскіх калектываў, якія аздабляюць свае строі этнаўзорамі. Майстар Валянціна Сільвановіч з аддзела рамёстваў Лідскага цэнтра народнай тварчасці расказала, што тут стварылі нават курсы для аматараў ткацтва. І дасведчаныя ткачыхі і навічкі — усе працуюць за старымі кроснамі, якія даставалі з гарышча і прыводзілі ў парадак. Цяпер у аддзеле каля 10 станкоў, палова з якіх працуе, астатнія стаяць сабраныя. Калі ахвотных засвоіць ткацтва стане больш, іх таксама пусцяць у справу. Па словах Валянціны Сільвановіч, многім гэта работа падаецца вельмі маруднай, асабліва каб заправіць станок.

Мясцовыя жыхары ведаюць пра славутыя лідскія ручнікі і купляюць іх на вяселлі, у падарунак. Цікавяцца і замежныя турысты. Кошт такога ручніка — ад 40 да 70 рублёў. Пасля таго, як вырабы ўключылі ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны, попыт на іх узрос.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.45 | 21.31 | 16.46 |
| Віцебск — | 4.27 | 21.28 | 17.01 |
| Магілёў — | 4.35 | 21.21 | 16.46 |
| Гомель — | 4.40 | 21.09 | 16.29 |
| Гродна — | 5.02 | 21.45 | 16.43 |
| Брэст — | 5.11 | 21.36 | 16.25 |

## Месяц

*Поўня 29 мая.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

***Пр.*** *Дзмітрыя, Івана, Ігната, Карнілы, Мітрафана, Сяргея.*
***К.*** *Магдалены, Кандрата, Якуба.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




# Гараскоп стрыжак на чэрвень

**1 чэрвеня, пятніца.** Сёння лепш проста падраўняць кончыкі грыўкі.

**2 чэрвеня, субота.** Сёння стрыжка ўзмоцніць вастрыню інтуіцыі, што дапаможа вам дасягнуць пастаўленых мэтаў. Афарбоўванне ў гэты дзень дадасць прывабнасці.

**3 чэрвеня, нядзеля.** Калі вам не хапае навізны, смела ідзіце ў цырульню, а калі любіце стабільнасць, то лепш для стрыжкі выбраць іншы дзень.

**4 чэрвеня, панядзелак.** Стрыжка будзе садзейнічаць ачышчэнню арганізма, пазбаўленню ад негатыўных эмоцый.

**5 чэрвеня, аўторак.** Сёння стрыгчыся не рэкамендуецца. Гэта можа негатыўна адбіцца на вашым здароўі.

**6 чэрвеня, серада.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**7 чэрвеня, чацвер.** Няўдалы дзень для паходу ў цырульню: любыя працэдуры для валасоў могуць стаць няўдалымі.

**8 чэрвеня, пятніца.** Калі хочаце пазбегнуць непрыемнасцяў, адкладзіце стрыжку.

**9 чэрвеня, субота.** Сёння валасы не варта ні стрыгчы, ні нават мыць.

**10 чэрвеня, нядзеля.** Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, добра паўплывае на вашу прывабнасць і здароўе. Дзякуючы таму, што месяц убывае, валасы будуць расці павольней, гэта дапаможа захаваць прычоску надоўга.

**11 чэрвеня, панядзелак.** Усе віды дзеянняў з валасамі, выкананыя ў гэты дзень, прывядуць да сямейнага дабрабыту і шчасця.

**12 чэрвеня, аўторак.** Стрыжка надасць больш энергіі, жыццёвых сіл.

**13 чэрвеня, серада.** Калі вырашыцеся на стрыжку менавіта сёння, майце на ўвазе, што гэта павінен быць крайні выпадак. А даўжыня астрыжаных валасоў — не больш за тры сантыметры.

**14 чэрвеня, чацвер.** Сёння не рэкамендуецца якія-небудзь сур'ёзныя змены ў прычосцы, бо гэта можа прыцягнуць негатыўную энергію.

**15 чэрвеня, пятніца.** Сёння валасы стрыгчы не варта, бо знаходжанне Месяца першапачаткова дрэнна ўплывае на стан валасоў.

**16 чэрвеня, субота.** Сёння становічы астралагічны прагноз для стрыжкі, бо фаза месяца становіча паўплывае на актыўны рост і гушчыню.

**17 чэрвеня, нядзеля.** Стрыжка сёння не толькі забяспечыць добрую форму, але і будзе становіча ўплываць на здароўе валасоў.

**18 чэрвеня, панядзелак.** Удалы дзень. Новая прычоска і афарбоўванне валасоў — гэта ўсё прыцягне ў ваша жыццё ўдачу і матэрыяльныя даброты.

**19 чэрвеня, аўторак.** Цудоўны дзень для стрыжкі — яна дапаможа абзавесціся прыемнымі і перспектыўнымі знаёмствамі, прыцягне новыя яркія ўражанні.

**20 чэрвеня, серада.** Спрыяльны дзень для стрыжкі.

**21 чэрвеня, чацвер.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі.

**22 чэрвеня, пятніца.** Не самы ўдалы дзень для стрыжкі: валасы будуць адрастаць даволі павольна, а прычоска можа зусім не задаволіць.

**23 чэрвеня, субота.** Новая стрыжка становіча паўплывае на ўзаемаадносіны з дамачадцамі і каханым чалавекам.

**24 чэрвеня, нядзеля.** Дзень для стрыжак лічыцца нейтральным.

**25 чэрвеня, панядзелак.** Ндрэнны дзень для стрыжкі: ёсць усе шанцы, што стрыжка дапаможа ўмацаваць валасы, зробіць больш густымі і здаровымі.

**26 чэрвеня, аўторак.** Хочацца змяніць жыццё — зрабіце кардынальна кароткую стрыжку.

**27 чэрвеня, серада.** Выдатны дзень для стрыжкі. Вы станеце больш удачлівым.

**28 чэрвеня, чацвер.** Не найлепшы дзень для паходу ў салон.

**29 чэрвеня, пятніца.** Пасля стрыжкі валасы будуць адрастаць вельмі павольна.

**30 чэрвеня, субота.** Для таго каб праявіць свае інтуітыўныя здольнасці, вам варта трохі падраўняць канцы валасоў. Радыкальная стрыжка сёння не вітаецца.

## Неспрыяльныя дні і гадзіны ў чэрвені

**2, субота,** *5.30 — 19.00*
**4, панядзелак,** *6.00 — 24.00*
**5, аўторак,** *0.00 — 13.00*
**7, чацвер,** *8.30 — 23.00*
**9, субота,** *20.00 — 24.00*
**10, нядзеля,** *0.00 — 6.00*
**12, аўторак,** *5.30 — 9.00*
**13, серада,** *21.30 — 24.00*
**14, чацвер,** *0.00 — 9.30*
**15, пятніца,** *18.30 — 24.00*
**16, субота,** *0.00 — 9.30*
**18, панядзелак,** *5.30 — 10.30*
**20, серада,** *13.00 — 14.30*
**22, пятніца,** *3.30 — 21.00*
**24, нядзеля,** *16.00 — 24.00*
**25, панядзелак,** *0.00 — 6.30*
**26, аўторак,** *15.30 — 24.00*
**27, серада,** *0.00 — 17.00*
**29, пятніца,** *10.00 — 24.00*
**30, субота,** *0.00 — 6.30*

## УСМІХНЕМСЯ

**Жанчыны — вельмі хітрыя стварэнні: аднолькавыя сукенкі іх раз'юшваюць, а аднолькавыя смартфоны — не!**

— Што ў вас у багажніку?
— Паляўнічы карабін і муляж цешчы.

**Учора позна ўвечары за рулём ледзь прытомнасць не страціў, калі за горадам у цемры ўбачыў шкілеты, якія перабягалі дарогу.**
**Аказалася, на пешаходах былі святлоадбівальныя нашыўкі.**

— О, дзе ж той Мужчына, які пакахае мяне такой, якая я ёсць?!
— Вось ён я, я кахаю цябе!
— Вой, не, ты страшны...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1989.
Нумар падпісаны ў 19.30 31 мая 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

1 чэрвеня 2018 г. № 22 (455)



стар. 3

**Што можа дэпутат?**



стар. 13

**Няхай будзе сыр!**



стар. 16

**Сельскія бібліятэкі прапануюць...**

ТЭМА ТЫДНЯ

# ТУРЫСТЫЧНАЯ БЕЛАРУСЬ

## Ці шукаем мы свае цікавінкі і чым прыцягваем гасцей



**НЕ зважаючы на крызісы, войны і катастрофы, у людзей заўсёды будзе жаданне падарожнічаць. Цяга да змены месцаў, адчуванняў і ўражанняў — неад'емная частка чалавечай істоты. Беларусь, геаграфічна знаходзячыся ў цэнтры еўрапейскага кантынента, не можа не карыстацца становішчам і не развіваць турызм. Прыемна, што ўсё часцей мы з'яўляемся ў разнастайных рэйтынгах краін, найбольш прывабных для турыстаў. Напрыклад, па выніках 2017 года Беларусь заняла трэцяе месца ў намінацыі «Гастранамічны і агратурызм» у рэйтынгу «National Geographic Traveler Awards» сярод найлепшых турыстычных дэсцінацый.**

Тое, што краіна ў апошняе дзесяцігоддзе ўсё часцей становіцца гаспадыняй буйных спартыўных спаборніцтваў, культурных фэстаў, дзелавых форумаў, вымушае ўдзяляць развіццю турызму ўсё большую ўвагу, каб прымаць гасцей рознага ўзроўню даходаў, прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў і культур і арганізоўваць іх вольны час так, каб яны ўсё часцей вярталіся ў Беларусь. Разам з гэтым адбываюцца сур'ёзныя зрухі ў развіцці інфраструктуры.

стар. 4, 13

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# ВЫСЛУХАЛІ, ПАЧУЛІ. БУДЗЕМ РЭАГАВАЦЬ

## Канструктыўны дыялог дапамагае знайсці паразуменне

**БОЛЬШ як дзве з паловай гадзіны доўжылася сустрэча мясцовых уладаў і жыхароў вёскі Дроздава Мінскага раёна ў Доме культуры аграгарадка Лясны — людзей хвалявала далейшае развіццё жыццезабеспячэння і ўдасканаленне ўмоў быту ў гэтым населеным пункце.**

### Што ёсць і што будзе

**Старшыня Бараўлянскага сельвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ** прапанавала ўсе пытанні разглядаць у комплексе, кантэксце перспектыў і змен, якія адбыліся на тэрыторыі сельсавета, Мінскага раёна і цэнтральнага рэгіёна ў цэлым, паколькі яны датычацца непасрэдна і жыхароў Дроздава. З гэтай мэтай Жанна Аляксандраўна запрасіла на абмеркаванне ўсіх зацікаўленых асоб, прадстаўнікоў раённай улады, дэпутатаў розных узроўняў, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый. Яны расказалі аб планах на перспектыву, адказалі на пытанні.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Нацыянальнага сходу Беларусі Валянціна КУРСЕВІЧ,** якая балатавалася па Заслаўскай выбарчай акрузе № 77, пачынала дзей-



насць менавіта ў Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы ў 1988 годзе. Тады насельніцтва прысталічнага рэгіёна складала 126 тысяч, сёння — звыш 220 тысяч чалавек. І штогод прырастае амаль на сем тысяч. Сёння за змену ўрачы прымаюць 1200 пацыентаў. Акрамя таго, на базе «дарослай» паліклінікі абслугоўваецца 13 тысяч дзяцей. І, вядома, наспела патрэба ў новай медыцынскай установе, у тым ліку і дзіцячай. У трэцім квартале ўвойдзе ў строй новы тэрапеўтычны корпус Мінскай раённай цэнтральнай бальніцы з рэанімацыйным, педыятрычным, кардыялагічным, інсультным аддзяленнямі.

**Галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы, дэпутат Мінскага абласнога Савета Андрэй КАРОЛЬКА** канстатаваў, што ў цэнтральным рэгіёне працуюць над стварэннем буйных раённых медыцынскіх спецыялізаваных цэнтраў. Адзін з іх з'явіцца на базе раённай бальніцы і пачне прымаць жыхароў раёнаў, якія прылягаюць да Мінскага. Гэтыя ўстановы будуць аснашчаны сучасным абсталяваннем, цалкам укамплектаваны медыцынскімі кадрамі.

У студзені 2018 года на сесіі абласнога Савета дэпутатаў зацверджана інвестыцыйная праграма будаўніцтва ў Мінскай вобласці. З 60 запланаваных аб'ектаў 11 прадугледжаны на тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета. У тым ліку будаўніцтва кансультатыўнай паліклінікі з кардыялогіяй, дыспансерам пры абласной бальніцы, а таксама паліклінічнага корпуса на 800 наведванняў у змену пры Мінскай раённай бальніцы.

стар. 15

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Візіт быў выніковым

*На гэтым тыдні ў Савеце Рэспублікі беларускага парламента прымалі балгарскіх калег*



**Адбылася сустрэча рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Балгарыя і дэлегацыі групы дружбы «Балгарыя — Беларусь» Народнага сходу Рэспублікі Балгарыя на чале з яе кіраўніком Васілам АНТОНАВЫМ. Па выніках сустрэчы была падпісана сумесная заява.**

Бакі абмеркавалі пытанні міжпарламенцкага і гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Яны пацвердзілі ўзаемную цікавасць умацоўваць двухбаковыя сувязі і пашыраць партнёрства па ўзаемавыгадных кірунках. У якасці прыярытэтных сфер узаемадзеяння адзначаны сельская гаспадарка, транспартны комплекс, турызм, адукацыя, навука. Асаблівая ўвага ўдзелена ўмацаванню рэгіянальнага супрацоўніцтва.

Парламенцкае вымярэнне адыгрывае важную ролю ў пашырэнні ўзаемадзеяння паміж краінамі, падкрэсліла кіраўнік рабочай групы, **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА.** «Мы спадзяёмся, што ўзмацненне нашага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння будзе спрыяць як рэалізацыі ўжо існуючых сумесных праектаў, так і з'яўленню новых», — заявіла яна.

У сваю чаргу Васіл Антонаў адзначыў, што ў рамках візіту парламенцкай дэлегацыі Балгарыі ў Мінск адбыўся шэраг важных сустрэч, у тым ліку са старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам Мясніковічам. «Мы запрасілі старшыню Савета Рэспублікі ад імя старшыні парламента Балгарыі наведаць нашу краіну з афіцыйным візітам, — праінфармаваў ён. — У цэлым для нас візіт у Мінск быў выніковым. Удалося абмеркаваць шырокі спектр пытанняў, сярод якіх — гандлёва-эканамічныя адносіны і турызм».

## Як дзяліць тэрыторыю?

*Над пытаннем працуе рабочая група*

**У верхняй палаце беларускага парламента адбылося першае пасяджэнне рабочай групы па вывучэнні эфектыўнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Рэспублікі Беларусь і выпрацоўцы прапаноў па яго ўдасканаленні.**

Мерапрыемства прайшло пад кіраўніцтвам старшыні **Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.** Удзельнікі пасяджэння разгледзелі шэраг напрамкаў па ўдасканаленні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання краіны.

У Савеце Рэспублікі ў адпаведнасці з планам дзеянняў па рэалізацыі даручэнняў кіраўніка дзяржавы створана рабочая група па вывучэнні эфектыўнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання Рэспублікі Беларусь і выпрацоўцы прапаноў па яго ўдасканаленні. Плануецца, што будзе сабрана і прааналізавана ўся аналітычная інфармацыя, якая стане асновай для далейшай работы ў гэтым кірунку.

## Кантрактаў — на паўмільярда

*Сенатар узяў удзел у эканамічным форуме*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў прыняў удзел у XV Гомельскім эканамічным форуме.**

У гэтым годзе форум сабраў больш за 650 удзельнікаў. Сярод іх — прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, супрацоўнікі дыпламатычных прадстаўніцтваў, работнікі банкаўскіх і фінансавых устаноў, бізнесмены.

Названы форум як адзін з інструментаў прыцягнення ўнутраных і знешніх інвестыцый прэзентаваў эканамічны і інвестыцыйны патэнцыял рэгіёна. Падпісана кантрактаў на агульную суму каля $500 млн.

Гомельскі эканамічны форум упершыню быў праведзены ў 2004 годзе. З 2008 па 2017 год падчас такіх форумаў падпісана 88 дакументаў — амаль на $2 млрд, рэалізаваны або знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі каля 50 праектаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ!

# ПААБЯЦАЛІ — ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ

**ПРАЙШЛО тры месяцы з таго часу, як свае пасады занялі новаабраныя кіраўнікі прадстаўнічай улады базавага ўзроўню. Першыя 100 дзён у новай якасці дазваляюць не толькі агледзецца, адчуць праблемы, але і ўбачыць спосабы іх вырашэння. Новыя старшыні раённых Саветаў дэпутатаў падзяліліся першым досведам і тымі задачамі, якія мяркуюць вырашыць у найбліжэйшыя гады на сваіх тэрыторыях.**

**Старшыня Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў Людміла ВЯЛІЧКА:**

— Важна працягваць добрыя традыцыі, якія былі закладзены папярэднікамі. Заўсёды актуальнымі застаюцца задачы добраўпарадкавання тэрыторый і навядзення парадку на зямлі. Будзем і надалей праводзіць акцыю «Мы побач»: дзецям-сіротам, інвалідам і многім іншым нашы дэпутаты аказваюць дапамогу. Ёсць у нас і дзень сельсавета, дзень дэпутата. Разам з дэпутатамі пярвічнага і базавага ўзроўняў, кіраўнікамі службаў райвыканкама выязджаем у кожны населены пункт раёна, праводзім сустрэчы з насельніцтвам. Жыхары расказваюць пра свае праблемы. Мы разам іх абмяркоўваем, робім пратакол даручэнняў. І абавязкова праз месяц аналізуем іх выкананне. Цяпер мы працуем над стварэннем маладзёжнага парламента, у які ўвойдуць навучэнцы школ, ліцэяў, каледжаў і рабочая моладзь ад 14 да 25 гадоў. Хацелася б, каб маладыя больш дапамагалі ў вырашэнні важных для Светлагоршчыны праблем. У Год малой радзімы мы аб'явілі акцыю «Зямля майго дзяцінства». Імкнёмся звярнуць увагу землякоў на родныя мясціны. Увогуле, мне здаецца, што сёння важна інфармаваць насельніцтва пра дзейнасць дэпутатаў, якія вельмі многа добрага робяць.

**Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр ТКАЧОЎ:**

— Для мяне прыярытэтныя кірункі — гэта непасрэдная работа з насельніцтвам, рашэнне пытанняў па забеспячэнні жыццядзейнасці грамадзян, па павышэнні ўзроўню іх жыцця. Для гэтага важна ствараць новыя рабочыя месцы і аказваць садзейнічанне ў працаўладкаванні. У Год малой радзімы трэба вялікую ўвагу ўдзяліць добраўпарадкаванню нашых аграгарадкоў і вёсак. Будзем рабіць усё, каб населеныя пункты станавіліся больш чыстымі і камфортнымі. Усе пытанні, якія ставяць перад нашымі дэпутатамі выбаршчыкі, мы паступова вырашаем.

**Старшыня Добрушскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір ЕМЯЛЬЯНАЎ:**

— Перш за ўсё — клопат пра людзей. Зразумець іх праблемы дапамагаюць гарачыя лініі і прыёмы па асабістых пытаннях. Наша задача — зрабіць так, каб насельніцтву жылося камфортна. Мы абмяркоўваем усе скаргі грамадзян разам з прадстаўнікамі выканаўчай улады. Звяртаемся ў вобласць у тых выпадках, калі патрэбны фінансы, каб рашыць праблему. Нам тэлефануюць і з падзякамі за зробленыя справы. Ёсць і праблемныя пытанні, на якія трэба хутка рэагаваць. Часцей за ўсё гэта пытанні камунальныя, гандлёвае абслугоўванне на вёсцы, водазабеспячэнне, дрэнныя дарогі на ўскраінах населеных пунктаў. Не ўсё проста, таму многія пытанні вырашаюцца сумесна з выканаўчымі ўладамі. Нават калі не атрымліваецца нешта вырашыць, імкнёмся, каб людзі нас зразумелі: чаму іх просьбу немагчыма выканаць сёння. Запэўніваем, што гэта адбудзецца крыху пазней.

**Старшыня Рэчыцкага раённага Савета дэпутатаў Рыгор ЯКУШАЎ:**

— Асноўны кірунак — сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэчыцкага раёна, клопат пра людзей. Цяпер мы праводзім сходы па аднаўленні органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Яшчэ займаемся добраўпарадкаваннем населеных пунктаў і ўцягненнем земляў у севазварот. Таксама актыўна працуем над рэалізацыяй указа па зносе старога жылля. Нядаўна ўсе сумесна прымалі ўдзел у пасадцы лесу. Ну а пастаянная наша работа, якую мы не збіраемся прыпыняць, — сумесна з кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый займаемся добраўпарадкаваннем і навядзеннем парадку ў населеных пунктах. Сельвыканкамы, да таго ж, прымаюць удзел у добраўпарадкаванні аб'ектаў і лесапалос уздоўж чыгункі.

**Старшыня Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў Сяргей КАСІНСКІ:**

— Гарадскі пасёлак Лельчыцы зусім невялікі, але ж нам заўсёды прыемна чуць, у тым ліку ад замежных гасцей, што ў глыбінцы Палесся такая чысціня. У нашых населеных пунктах імкнёмся падтрымліваць парадак на зямлі і садзейнічаць наблюдэнню ўмоў, у якіх жывуць вясковыя жыхары, да ўмоў у райцэнтрах. Узнікае шмат праблем: ёсць пытанні па рамонце дарог на аддаленых вуліцах. Актуальнае для нас забеспячэнне якаснай пітной вадой. Многія праблемы, якія агучваюць людзі, вырашаюцца тэрмінова. Напрыклад, выдзяленне земельных участкаў для вядзення падсобнай гаспадаркі. Дэпутацкім корпусам папярэдняга склікання зроблена вялікая работа, у тым ліку па рэалізацыі Указа № 100 па зносе трухлявага жылля. Нам трэба і надалей акультурваць нашы населеныя пункты, зносіць дамы, якія пустуюць і псуюць выгляд населеных пунктаў. Мы ж і ў самай глыбінцы Палесся заўсёды памятаем пра тое, што прадстаўляем усю Беларусь, за якую хочацца ганарыцца паўсюдна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ІНФАРМАЦЫЯ НЕ ДАХОДЗІЦЬ

Многія маладыя людзі не ведаюць пра існаванне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі

**Такое меркаванне выказаў дацэнт кафедры паліталогіі, сацыялогіі і сацыяльнага кіравання факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі БНТУ Аляксей БЯЛЯЕЎ на круглым стале, які быў прысвечаны далучэнню моладзі да парламенцкай дзейнасці.**

Мерапрыемства адбылося ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, удзел у ім прынялі не толькі парламентарыі, прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання, навуковых арганізацый, але і студэнты.

«Гэта праблема інфармаванасці ў цэлым нашага грамадства, — адзначыў палітолаг. — Трэба адыходзіць ад афіцыёзных формаў і набліжаць інфармацыю да чалавека. Гэта значыць, інфармаванне грамадства праз нейкія нефармальныя акцыі, дзейнасць маладзёжных парламенцкіх структур — так будзе cапраўды цікавей».

Як пракаментаваў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Леанід ЦУПРЫК,** на круглым стале не стаяла задача ўсеагульнай парламентарызацыі рэгіёнаў. «Не, гэта ўсё павінна выспець натуральным чынам. Адна з такіх яркіх формаў, як маладзёжны парламент, будзе ствараца там, дзе з'явіліся для гэтага неабходныя ўмовы», — сказаў дэпутат.

На яго думку, беларуская моладзь не спіць, будзіць яе не трэба, яна актыўна працуе і дзейнічае. Ён таксама дадаў, што ў нашай краіне шмат гадоў фактычна дзейнічае правобраз маладзёжнага парламента — БРСМ, іх функцыі ідэнтычныя.

Што неабходна для стварэння маладзёжных парламентаў? «Першае — наяўнасць лідараў, грамадска-актыўных маладых людзей, якія жадаюць займацца гэтай дзейнасцю, — гэта галоўная ўмова, — падкрэсліў Леанід Цупрык. — Па прымусе тут нічога не можа быць. Усё астатняе — матэрыяльная і арганізацыйная аснова, — тут дапамогуць улады».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

ДЫЯЛОГІ «МС»

# Сяргей СМОЛЬСКІ: «Калі можаш дапамагчы людзям, непрыстойна хавацца ў кусты»

**КІРАЎНІК адной з гандлёвых сетак сталіцы — ААТ «Постгандаль» — Сяргей Смольскі — чалавек, можна сказаць, унікальны. На апошніх выбарах ужо сёмы раз стаў дэпутатам Мінскага гарадскога Савета. Такім чынам, ён амаль чвэрць стагоддзя сумяшчае асноўную прафесійную дзейнасць з абавязкамі народнага выбранніка. Як пры такім рэжыме не захварэць на раздваенне асобы? З гэтага жартаўлівага пытання пачалася наша размова з аксакалам сталічнага «парламента».**

— Я і сам часта не ведаю, дзе ўва мне заканчваецца работнік гандлю і пачынаецца дэпутат, — смеючыся, гаворыць Сяргей Аляксандравіч. — Але калі казаць сур'ёзна, то адна іпастась другой вельмі дапамагае. І там, і там справу маеш з людзьмі. Дзе, як не ў крамах, лепш за ўсё адчуваюцца запатрабаванні і праблемы грамадзян? Дзякуючы жывому кантакту больш глыбока пранікаеш у сутнасць тых ці іншых сацыяльных і эканамічных з'яў, дакладней, выбіраеш арыенціры ў дэпутацкай рабоце. І, наадварот, сустракаючыся з выбаршчыкамі ў якасці прадстаўніка гарадскога Савета, нярэдка чуеш слушныя прапановы для паляпшэння гандлёвага абслугоўвання.

> Мы любім бурчаць, праяўляць незадаволенасць, але калі ёсць працоўныя месцы, больш-менш дастойны заробак, а вакол — мір і парадак, то што яшчэ трэба?

***— Нікога не хачу пакрыўдзіць, Сяргей Аляксандравіч, але ж дэпутат мясцовага Савета не такая ўжо вялікая шышка, каб вырашаць складаныя пытанні. Няўжо да вас і сапраўды ідуць людзі з верай у тое, што зможаце ім дапамагчы?***

— Ішлі, ідуць і, упэўнены, будуць ісці. Бо не толькі вераць, а ведаюць з досведу мінулых гадоў, што іх выбраннік хоць і не вялікая, як вы выказаліся, шышка, але мае пэўны ўплыў на дзейнасць гарадскіх улад. Вядома, калі да мяне звяртаюцца с просьбай дапамагчы, напрыклад, атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва кватэры без законных падстаў, то тут прасіцеля чакае расчараванне. Падобных выпадкаў, калі выбаршчыкі падштурхоўваюць свайго дэпутата, па сутнасці, заплюшчыць вочы на юрыдычныя нюансы, даволі шмат: ад патрабаванняў адрэзаць у суседа кавалак зямельнага ўчастка да ўцягвання ў судовыя цяжбы па раздзеле маёмасці. Гэта адбываецца таму, што па асабістых пытаннях да дэпутата прыходзяць у асноўным тады, калі сітуацыя бязвыхадная. У іншых жа выпадках праблемы людзей, хоць і не без цяжкасцяў, удаецца вырашаць. Асабліва калі паступаюць калектыўныя звароты. У адрозненне ад асабістых, яны часцей за ўсё справядлівыя і сапраўды патрабуюць сур'ёзнай увагі.

***— А калі канкрэтна? Вось вас у лютым абралі на чарговы дэпутацкі тэрмін. Ці далі сабе час на развярушванне або паспелі ўжо цалкам акунуцца ў надзённыя праблемы сваіх выбаршчыкаў?***

— Доўга запрагаць — не ў маёй натуры. Тым больш што многія праблемы мне добра вядомыя. Гэта, дарэчы, выгадна адрознівае дэпутата са стажам ад навічка, якому патрэбна нямала часу, каб азнаёміцца са становішчам у сваёй выбарчай акрузе. У маёй — а гэта мікрараёны Сцяпянка і Сляпянка з колькасцю насельніцтва каля 30 тысяч — людзі традыцыйна далі мне дэпутацкі наказ. Пералічу толькі асноўныя яго пункты, над выкананнем якіх цяпер працую. У Сцяпянцы намечана маштабнае будаўніцтва. Але грамадзян усхвалявала, што, паводле першапачатковага плана, увядзенне ў строй паліклінікі, школы і дзіцячых садкоў павінна было адбывацца пазней, чым увод жылых аб'ектаў. Дапусціць такое — значыць стварыць ачаг сацыяльнай напружанасці. Дзякуючы прынцыповай пазіцыі прадстаўнічай улады і маім асабістым намаганням паслядоўнасць будаўнічых работ удалося скарэкціраваць. Цяпер яны будуць весціся з улікам патрабаванняў жыхароў. Рэалізацыя праекта разлічана гадоў на дзесяць. Што датычыцца больш сціплых задач, то яны будуць вырашаны ўжо сёлета. Напрыклад, па наказе выбаршчыкаў знясуць былы Дом афіцэраў, які струхлеў, і ўзвядуць на яго месцы што-небудзь патрэбнае. Таксама будзе праведзены рамонт дарожнага пакрыцця па Калектыўным праездзе, чаго даўно чакаюць тутэйшыя жыхары. Як і добраўпарадкавання зоны адпачынку насупраць вуліцы Лесапаркавай. Калі не ў гэтым, то ў наступным годзе яно будзе абавязкова зроблена.

Адна з самых сур'ёзных праблем — адсутнасць у Партызанскім раёне дзіцячай паліклінікі. Маленькіх пацыентаў бацькі возяць на прыём да ўрача ў іншы канец горада. Аказалася, што такая ж бяда ў жыхароў суседняй выбарчай акругі — Трактаразаводскай. Вырашана да 2021 года пабудаваць неабходную медыцынскую ўстанову па вуліцы Даўгабродскай. Падарунак, так бы мовіць, і для тых, і для іншых.



***— Сяргей Аляксандравіч, а вам было калі-небудзь сорамна перад чалавекам за тое, што не змаглі яму дапамагчы? Ці з-за таго, што проста адмахнуліся ад надакучлівага скаржніка?***

— Такога, каб я не знаходзіў сабе месца ад перажыванняў за нейкую непавагу да прасіцеля, некампетэнтнасць ці бяздзейнасць у дачыненні да яго справы, не памятаю. Бо адмаўляць у садзейнічанні даводзілася менавіта тады, калі праблема, пра што ўжо казаў, выходзіла за рамкі закона. Або патрабаванне выглядала абсурдным. Ну вось неяк прыйшоў да мяне адзін выбаршчык і пачаў настойваць, каб я прыняў меры для забароны ўзвядзення высотнага дома. «Гэты архітэктурны монстр, — абураўся ён, — засланяе мне сонца!» Ну што тут зробіш?

***— А якая справа выклікае ў вас як у народнага выбранніка пачуццё гордасці за сваю працу?***

— Гордасць — гэта, можа, занадта гучна будзе сказана, а вось адчуванне глыбокага задавальнення атрымліваў не раз. Асабліва памятаецца эпапея з адкрыццём філіяла паліклінікі па вуліцы Карвата. Доўгі час жыхары з таго раёна былі вымушаны са сваімі хваробамі ездзіць на край свету. Два гады я выступаў з гэтым пытаннем у Савеце, хадзіў на прыём да тагачаснага мэра Міхаіла Якаўлевіча Паўлава. Нарэшце філіял адкрылі, людзі былі вельмі ўдзячныя. Чытачы падумаюць: знайшоў чым ганарыцца! А я ўпэўнены, што з такіх вось «дробязяў» і складаецца аблічча ўлады. Калі яна ў стане стварыць чалавеку зручныя ўмовы жыцця з даступнымі школамі, дзіцячымі садкамі, магазінамі, добрымі дарогамі, прыгожымі паркамі, то гэта сведчыць пра многае. Ніколі не забуду, як пачыналася мая дэпутацкая дзейнасць. 1990 год, адкрываецца пасяджэнне гарсавета. А за акном на плошчы Леніна — велізарны натоўп народа. Людзі патрабуюць працы, хлеба, цыгарэт... У магазінах пуста. Цяжкасці з транспартам. У тую ж Сцяпянку дабрацца было немагчыма, бо там дарогі нагадвалі танкадром і ніхто іх не рамантаваў. Пра рамонт жылых дамоў не варта было і заікацца. Бясконцыя праблемы з каналізацыяй і ацяпленнем будынкаў. Скаргаў было столькі, што апускаліся рукі. Калі параўноўваць з цяперашнім часам, то прагрэс каласальны. Мы любім бурчаць, праяўляць незадаволенасць, але калі ёсць працоўныя месцы, больш-менш дастойны заробак, а вакол — мір і парадак, то што яшчэ трэба? Дарэчы, скаргаў з боку насельніцтва становіцца з кожным годам усё менш. Гэта сведчыць пра тое, што ўлады горада, у тым ліку і дэпутацкі корпус, дзейнічаюць даволі эфектыўна.

***— Але ж вы і вашы калегі займаецеся не толькі разглядам скаргаў, патрабаванняў і прапаноў сваіх выбаршчыкаў...***

— Калі б гэта было так, то нас усіх можна было б накіраваць дыспетчарамі ў ЖЭУ. На самай справе непасрэдныя кантакты з насельніцтвам — толькі частка дзейнасці дэпутата. Асноўнае — гэта ўдзел у рабоце сесій гарадскога Савета і яго пастаянных камісій. Дарэчы, я ўзначальваю адну з іх — па кіраванні і распараджэнні камунальнай маёмасцю. Важныя рашэнні выканаўчай улады, якія датычацца бюджэту горада, мясцовых падаткаў, інвестыцыйных праграм, прыватызацыі аб'ектаў, не могуць быць прыняты без зацвярджэння гарсавета. Акрамя таго, мы займаемся тым, што сумесна з Мінгарвыканкамам усе законы парламента, прэзідэнцкія ўказы, пастановы ўрада павінны адаптаваць пад умовы сталіцы. Гэта бясконцы паток дакументаў. Прытым не забывайце, што ў кожнага з дэпутатаў мясцовага ўзроўню ёсць асноўныя месцы працы на прадпрыемствах, у медыцынскіх установах, сферах адукацыі, культуры, абслугоўвання і г. д. У Савеце яны, па сутнасці, выконваюць грамадскую нагрузку.

***— Няўжо вы не атрымліваеце за яе ніякіх матэрыяльных выгод?***

— Не. І не маем ніякіх прывілей. Калі пра гэта даведваюцца мае выбаршчыкі, то вельмі дзівяцца.

***— Які ж інтарэс узвальваць на сябе ўсе гэтыя турботы замест таго, каб спакойна адпачываць у свой свабодны час?***

— Колькі разоў задаваўся гэтым пытаннем! І заўсёды прыходзіў да такой думкі. Канешне, можна ляжаць перад тэлевізарам, глядзець навіны, абурацца, усё крытыкаваць. Але ж ад гэтага лягчэй не стане. Асабліва калі ведаеш, што нехта за цябе ўсталёўвае правілы жыцця. Дык ці не лепш самому прымаць актыўны ўдзел у іх выпрацоўцы? А калі яшчэ можаш дапамагчы канкрэтным людзям, то тут і зусім непрыстойна хавацца ў кусты.

> 1990 год, адкрываецца пасяджэнне гарсавета. А за акном на плошчы Леніна — велізарны натоўп народа. Людзі патрабуюць працы, хлеба, цыгарэт... У магазінах пуста.

***— Але ўсё ж такі крыўдна нічога не атрымліваць за сваю працу?***

— Грошы тут не галоўнае. Што на самай справе крыўдна, дык гэта вечна быць у ролі прасіцеля. У дэпутата, асабліва мясцовага Савета, няма рэальных рычагоў для вырашэння нават самых дробных пытанняў. Каб дапамагчы людзям, ён вымушаны хадзіць па розных інстанцыях і прасіць. Мне здаецца, даўно наспела неабходнасць змяніць такую сістэму.

> **Павінен быць механізм, дзякуючы якому выканкам пасля афіцыйнага звароту народнага выбранніка неадкладна прымаў бы меры па вырашэнні тых ці іншых праблем насельніцтва.**

Распрацаваць мадэль такіх узаемаадносін паміж выканаўчай і прадстаўнічай уладамі можна было б даручыць спецыяльнай групе, у склад якой увайшлі б усе зацікаўленыя бакі. У тым ліку члены і дэпутаты Нацыянальнага сходу. Аднак пакуль далей развагаў справа не ідзе. Шкада. Бо падобныя нават ўвядзенні значна актывізавалі б дзейнасць мясцовых органаў, садзейнічалі б развіццю дэмакратыі, павышэнню ініцыятыўнасці людзей на карысць усяго грамадства.

**Гутарыў Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

# ТУРЫСТЫЧНАЯ БЕЛАРУСЬ




## Нашы музеі і сусветныя тэндэнцыі

Самы папулярны від турызму, у рамках якога Беларусь наведваюць замежнікі, — культурна-пазнавальны. Па прычыне геаграфічнага становішча краіна апошнія 2—3 стагоддзі вельмі часта знаходзілася ў цэнтры ваенных дзеянняў, таму ў нас захавалася не так шмат помнікаў гісторыі і архітэктуры. Аднак мы можам пахваліцца чатырма аб'ектамі, якія ўваходзяць у спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, а гэта значыць, што пра іх ведаюць усе вандроўнікі, якія цікавяцца гісторыяй і культурай. Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежская пушча, Геадэзічная дуга Струвэ сёння з'яўляюцца аднымі з самых наведвальных месцаў у Беларусі і ўваходзяць практычна ў кожную турыстычную праграму. У турысцка-экскурсійных мэтах выкарыстоўваецца больш за 150 музейных устаноў сістэмы Міністэрства культуры, якія летась наведалі 6 353 233 чалавекі. Калі казаць аб архітэктурных помніках, то ў Беларусі іх налічваецца каля 5,5 тысячы. Не варта забываць і аб прыроднай спадчыне, а гэта больш за 20 тысяч рэк і каля 11 тысяч азёр.

> Часам менавіта дробязі здольныя сапсаваць уражанне турыстаў ад наведвання краіны.

**Кансультант Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Марына МАСТАШОВА** адзначае, што Мінспорту шчыльна і вынікова супрацоўнічае з Міністэрствам культуры ў рэалізацыі розных сумесных праектаў, у тым ліку па ўдасканаленні якасці прыёму турыстаў. «У апошнія гады і за кошт бюджэтнага фінансавання, і за кошт удзелу ў розных праектах міжнародна-тэхнічнай дапамогі нашы музеі абзавяліся аўдыягідамі, разнастайнымі інфакіёскамі. Гэта дазволіла разгрузіць адміністрацыю музеяў і зрабіць наведванне аб'ектаў больш камфортным для замежных турыстаў, якія аддаюць перавагу падарожжу індывідуальнаму, без групы, — расказвае Марына Веньямінаўна. — Самі работнікі музеяў у апошнія гады, разумеючы важнасць сваёй працы, ідуць насустрач турыстычным аператарам і часам, нават калі турыстычная група затрымліваецца, прыязджае пасля закрыцця музея, па ўзгадненні з адміністрацыяй прымаюць турыстаў».

**ТОП-5 музейных устаноў (па колькасці наведванняў турыстамі)**

1) Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 565 299.

2) Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» — 425 200.

3) Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» — 417 416.

4) Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь — 390 774.

5) Музей «Замкавы комплекс «Мір» — 301 464.

Спецыяліст Міністэрства адзначае, што практычна вырашана даўняя праблема з валоданнем супрацоўнікамі музеяў замежнымі мовамі. Пытанне застаецца актуальным толькі ў маленькіх гарадах і глыбінцы, яго спрабуюць вырашыць наяўнасцю аўдыягідаў.

Нашы музеі, ведаючы сусветныя тэндэнцыі, прапануюць такія паслугі, як квэсты. Дарэчы, першы гістарычны квэст турыстычныя фірмы сумесна з музеем-запаведнікам «Нясвіж» здзейснілі паўтара года таму.

Культурна-пазнавальны турызм ушчыльную звязаны з турызмам рэлігійным. У Беларусі існуе 26 рэлігійных канфесій, як сёння, так і стагоддзі таму на тэрыторыі краіны абсалютна мірна ўжываюцца людзі рознага веравызнання. Таму вялікай цікавасцю ў замежных турыстаў карыстаюцца рэлігійныя архітэктурныя помнікі, якія захаваліся ў Беларусі. Так, у Будславе можна ўбачыць каталіцкі касцёл, у Жыровічах і Полацку — праваслаўныя храмы, буйную мячэць — у Іўі, яўрэйскую сінагогу — у Гродне.

**Найбольш папулярныя ў турыстаў праваслаўныя святыні:**

Свята-Успенскі Жыровіцкі мужчынскі манастыр; Свята-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр у Полацку; храм Усіх святых і нявінна забітых у Айчыне нашай, Свята-Духаў Кафедральны сабор у Мінску; Барыса-Глебская (Каложская) царква ў Гродне;

Сярод каталіцкіх храмаў Беларусі асаблівай папулярнасцю ў беларускіх і замежных турыстаў карыстаюцца: Фарны касцёл у Нясвіжы; касцёлы Святых Сымона і Алены ў Мінску; імя святога Францішка Ксаверыя ў Гродне і іншыя.

## Наперад, да вытокаў

Адзін з самых масавых і запатрабаваных кірункаў — аграэкатурызм. У Беларусі ён пачаў актыўна развівацца з 2005 года, а 1 студзеня 2018-га налічвалася ўжо 2 319 суб'ектаў аграэкатурызму.

Лідзіруе па колькасці аграэкасядзіб Мінская вобласць (662 суб'екты). Найбольшая дынаміка росту адзначаецца ў Брэсцкай вобласці: за 2017 год колькасць аграсядзіб павялічылася на 25. Летась беларускія аграсядзібы наведалі 351 128 чалавек.

«Прыемна, што сёння да нас прыязджаюць спецыялісты з краін СНД, каб паглядзець, як за такі кароткі тэрмін мы змаглі прывабіць аграэкатурыстамам велізарную колькасць людзей, — расказвае Марына Масташова. — З аднаго боку, людзі зарабляюць на гэтым грошы, займаючыся любімай справай, а з другога — турысты маюць магчымасць пабываць у экалагічна чыстых зонах, спажываць экалагічна чыстыя прадукты, займацца абсалютна аўтэнтычнымі відамі вясковай дзейнасці, далучыцца да сваіх вытокаў».

Большасць беларускіх аграэкасядзіб вылучаецца сваёй самабытнасцю, іх уладальнікі распрацоўваюць разнастайныя культурныя праграмы, некаторыя маюць сваю спецыялізацыю і працуюць практычна як музеі. Хтосьці займаецца прапагандай беларускай інструментальнай музыкі, хтосьці адкрывае музей пчол або спецыялізуецца на нацыянальнай кухні, актыўным ладзе жыцця.

## Спорт, аздараўленне, «салодкія» экскурсіі...

Нельга не заўважыць, што ў апошнія гады ў Беларусі актыўна развіваецца і спартыўны турызм, улічваючы, што ў краіне з'явіліся сур'ёзнага ўзроўню спартыўныя збудаванні, яна стала арэнай правядзення буйных міжнародных спаборніцтваў. «Мы маем вялікі станоўчы вопыт правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. Ён паказаў, што Беларусь, з аднаго боку, мае спартыўныя комплексы, якія адпавядаюць міжнароднаму ўзроўню, а з другога — інфраструктуру і падрыхтаваны персанал, каб балельшчыкам, якія ў вольны ад матчаў час становяцца звычайнымі турыстамі, прапанаваць разнастайны комплекс паслуг, у тым ліку і падарожжа па нашай краіне, — адзначае спецыяліст дэпартамента па турызме. — Рыхтуючыся на будучы год прыняць II Еўрапейскія гульні, улічваем папярэдні досвед (глядзім і аналізуем, да чаго выяўляў цікавасць балельшчык), рыхтуем новыя праграмы».



Добра вядомая Беларусь і сваімі здраўніцамі, асабліва жыхарам краін постсавецкай прасторы. Папулярнасць санаторыяў можна растлумачыць адэкватнымі суадносінамі кошту і якасці. Асноўная маса турыстаў у гэтым кірунку — тыя, хто валодае рускай мовай. Аднак усё часцей з'яўляюцца госці з далёкага замежжа — як вынік таго, што ў новых санаторыях, асабліва ў прыгранічных зонах, з'яўляецца персанал, які валодае замежнымі мовамі.

Разам з санаторна-курортным аздараўленнем развіваецца медыцынскі турызм — тут у замежнікаў запатрабаваны паслугі ў стаматалогіі, лячэнні сардэчна-сасудзістых захворванняў, родадапамозе. «Практычна кожная медустанова ў краіне мае свой прайс на аказанне медыцынскіх паслуг замежным грамадзянам», — адзначае Марына Масташова.

У апошні час пачынае адраджацца від турызму, які раней называлі вытворчым, а цяпер — прамысловым. «Прадпрыемствы харчовай, лёгкай, цяжкай прамысловасці прапануюць турыстам наведаць свае цэхі, пазнаёміцца з прадукцыяй».

> Калі ў савецкі час многія заводы і прадпрыемствы адчынялі дзверы ў асноўным для школьнікаў з мэтай прафарыентацыі, то цяпер большасць нашых прадпрыемстваў разглядаюць вытворчы турызм як маркетынгавае мерапрыемства, магчымасць усталяваць кантакты, расказаць аб сваёй прадукцыі.

Большасць такіх экскурсій заканчваецца ў краме, дзе рэалізуецца прадукцыя. Гэта сусветны трэнд. У Беларусі лідарам такога турызму з'яўляецца БелАЗ — у 2016 годзе яго наведала каля 200 тысяч турыстаў. Падобныя экскурсіі таксама праводзяць «Камунарка», «Атлант», МАЗ, «Слодыч» і іншыя.

## «Ду ю спік інгліш?» і іншыя пытанні

Як правіла, турысты, якія прыязджаюць у Беларусь з суседніх краін, затрымліваюцца ў нас на 3—5 дзён. Людзі, якія дабіраюцца да Беларусі з дапамогай доўгіх пералётаў, выбіраюць больш працяглы адпачынак — ад сямі дзён. Для таго каб турыст затрымаўся ў тым ці іншым месцы, трэба забяспечыць яго не толькі аб'ектам, цікавым з турыстычнага пункту гледжання, але і забяспечыць жыллё, выгоды, добрае харчаванне, забавы і камфортнае перасоўванне па мясцовасці. Інакш кажучы, любая тэрыторыя павінна быць гатовая для сустрэчы гасцей.

Адно з праблемных пытанняў у Беларусі — гэта калі. Калі ў сталіцы і буйных абласных цэнтрах з іх наяўнасцю і абслугоўваннем пытанні ўзнікаюць рэдка, то ў маленькіх гарадках часам складана знайсці годнае месца для начлегу. Каб замежнік змог адчуць сябе ў нас як дома, неабходны персанал, які валодае хоць бы адной замежнай мовай. Сустрэць гэта ў аддаленых (ды і не вельмі) кутках Беларусі вельмі цяжка. Да чэмпіянату свету па хакеі нават у сталіцы абслугоўвае персанал гасцініц, магазінаў, пунктаў грамадскага харчавання праходзіў курсы па вывучэнні і ўдасканаленні замежнай мовы, такую ж практыку будуць уводзіць і напярэдадні Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

**Адкуль да нас прыязджаюць часцей за ўсё? Топ-10 краін па ўязным турызме ў Беларусь (2017 г.)**

Усяго краіну наведалі 4 327 813 (+3,5 % у параўнанні з 2016 годам)

1. Расія 1 229 797 чалавек
2. Украіна 1 205 254
3. Літва 670 200
4. Польшча 481 463
5. Латвія 140 440
6. Малдова 96 369
7. Германія 45 353
8. Казахстан 36 957
9. Турцыя 31 375
10. Ізраіль 24 183

> Што датычыцца пунктаў харчавання, турысты — гэта, як правіла, людзі, у якіх напружаны графік, яны не гатовы доўга чакаць заказ або выбіраць вельмі вытанчаныя стравы.

«Таму асноўныя патрабаванні да аб'ектаў харчавання — каб яны адначасова хутка і якасна маглі накарміць турыстычную групу каля 50 чалавек», — адзначае спецыяліст.

У маленькіх гарадах часта ўзнікаюць праблемы з арганізацыяй вольнага часу ўвечары, бо музеі ў нас звычайна зачыняюцца ў 19.00 і турыстам няма чым сябе заняць. З-за гэтага турыстычныя кампаніі вымушаны складаць

(Працяг. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

(Заканчэнне на 13-й стар. «МС».)

# «АБУРАЛЬНАЯ КАРЦІНА! КОТ — БЕЗ ХВАСТА, ЛІСА — У СУКЕНЦЫ»

## Цікавыя факты пра любімыя дзіцячыя стужкі «Беларусьфільма»

**Дзень абароны дзяцей — выдатная нагода ўспомніць фільмы для дзяцей і падлеткаў, якія сталі культавымі і на якіх вырасла не адно пакаленне. Яны скарылі сэрцы гледачоў сваёй дабрынёй і запалам, шчырасцю і верай у светлае заўтра. Многія знакамітыя савецкія фільмы зняты на кінастудыі «Беларусьфільм». Мы выбралі топ дзіцячых стужак, і можаце разглядаць гэта як прапанову асвяжыць у памяці старое добрае кіно.**

### «ПА САКРЭТУ ЎСЯМУ СВЕТУ»

Фільм з двух серый зняты па матывах «Дзяніскавых апавяданняў» Віктара Драгунскага. Над ім працавалі розныя маладыя рэжысёры, у тым ліку Ігар Дабралюбаў



і Віталь Канеўскі, якія пасля сталі знакамітымі. Фільм здымалі на працягу сямі месяцаў. Вышку, з якой Дзяніска пабаяўся скокнуць, на скорую руку пабудавалі пад Смалявічамі (кіношнікі называлі іх Смалявуд, паколькі на гэтай пляцоўцы «Беларусьфільма» здымалася шмат карцін). Сцэны ў цягніку здымалі на нядзейнай чыгуначнай ветцы таксама ў раёне Смалявічаў. Цягнік складаўся з лакаматыва і трох вагонаў. Састаў некалькі сутак ганялі ўзад-уперад. Песню «Па сакрэту ўсяму свету», якую палюбілі гледачы, напісалі спецыяльна для гэтага фільма кампазітар Уладзімір Шаінскі і паэт Міхаіл Таніч.

З усіх дзяцей, якія здымаліся ў фільме, акцёрам стаў толькі Валодзя Станкевіч, выканаўца галоўнай ролі. «Дзяніску Караблёва», дарэчы, выбіралі амаль з 15 тысяч дзяцей. Як прызнаваўся сам Уладзімір Станкевіч, на пробы ён прыйшоў, бо ў студыі мастацкага слова пры Палацы піянераў выступаў як чытальнік якраз з «Дзяніскавымі апавяданнямі» і вырашыў, што на здымках без яго не абысціся. Перад камерай хлопчык адчуваў сябе ўпэўнена, бо да гэтага паспеў зняцца ў чатырох фільмах. Каб ператварыць цёмнавалосага Валодзю ў бландзіна Дзяніску, яго фарбавалі перакісам вадароду, а каб хлопчык у адпаведных сцэнах мог заплакаць, у вочы закапвалі гліцэрын.

— Аднойчы слёзы ўсё ж былі сапраўдныя, — згадваў Уладзімір Станкевіч. — Рэжысёр адабраў у мяне білеты на футбол, і я заплакаў ад крыўды. Сцэну знялі і білеты мне вярнулі.

Пасля школы Уладзімір Станкевіч паступаў ва Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі, аднак не прайшоў. Нейкі час вучыўся ў інстытуце замежных моў, але хутка паступіў усё ж у тэатральны. Перыядычна здымаўся ў кіно, больш за 10 гадоў выступаў з ансамблем «Сябры», працаваў на беларускім тэлебачанні, быў прадзюсарам спявачкі Анжалікі Ют, якая, дарэчы, пасля стала яго жонкай. Зараз жыве ў Маскве і займаецца музычнымі праектамі.

### «ПРЫГОДЫ БУРАЦІНА»

Дзіцячы музычны фільм рэжысёра Леаніда Нячаева па матывах казкі Аляксея Талстога «Прыгоды Бураціна» з'явіўся на свет у 1975 годзе, а тэлепрэм'ера адбылася ў першыя дні 1976 года. Тарцілу ў фільме сыграла Рына Зялёная, а магла сыграць Фаіна Раneўская. Аднак яна адмовілася ехаць для здымак у Мінск па прычыне ўзросту і заявіла, што сыграе толькі ў выпадку, калі здымкі пройдуць у пад'ездзе яе дома. У песні чарапахі Тарцілы Рына Зялёная адмовілася выконваць другі куплет, бо ў ім гучаць радкі пра сталы ўзрост, у выніку ў фільме гучыць толькі музычны пройгрыш. Пасля здымак кінастудыя «Беларусьфільм» адмовілася прымаць мюзікл: «Абуральная карціна! Кот — без хваста, Ліса — у сукенцы, а Бураціна здзекуецца з пажылога чалавека!». Але фільм усё ж выпусцілі на экраны, бо быў канец года і невыкананне плана пагражала пазбаўленнем прэмій.



Выканаўца ролі Бураціна Дзіма Іосіфаў пасля фільма стаў атрымліваць шмат прапаноў для здымак, скончыў Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (курс Аляксея Баталава). Пасля размеркавання працаваў у Мінскім тэатры-студыі кінаакцёра, шмат здымаўся на розных кінастудыях, больш за ўсё — на «Ленфільме». Паралельна скончыў рэжысёрскае аддзяленне, стаў займацца рэжысурай кліпаў.

Выканаўца ролі Мальвіны Таццяна Працэнка трапіла ў фільм выпадкова. Асістэнт рэжысёра пазнаёмілася з ёй у цягніку. Пасля складаных кінапроб Таню зацвердзіў на ролю рэжысёр фільма Леанід Нячаеў. Спецыяльна для дзяўчынкі напісалі сцэнарый яшчэ аднаго фільма — «Пра Чырвоную Шапачку». Але з-за страсення мозга Тані так і не ўдалося зняцца ў ім. Перад здымкамі ў фільме «Прыгоды Бураціна» ў юнай актрысы выпалі малочныя зубы. Прыйшлося звярнуцца да стаматолага, каб не зрываць здымкі карціны. Актрысай у дарослым жыцці Таццяна Працэнка не стала з-за траўмы, хоць і скончыла Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі.

### «КОРЦІК» І «БРОНЗАВАЯ ПТУШКА»

Рэжысёр Мікалай Калінін у пачатку 70-х на аснове аповесцяў Анатоля Рыбакова зняў аднайменныя фільмы «Корцік» і «Бронзавая птушка» пра прыгоды неразлучных сяброў Мішкі, Генкі і Славы. За-



ключная частка трылогіі «Апошняе лета дзяцінства» была знята ўжо іншым рэжысёрам — Валерыем Рубінчыкам, бо Мікалай Калінін загінуў у 36-гадовым узросце падчас здымак «Бронзавай птушкі». Па афіцыйнай версіі — ад інфекцыйнага менінгіту, па неафіцыйнай — ад траўмаў унутраных органаў, атрыманых падчас бойкі. Нешчасліва склаліся лёсы і ўсіх выканаўцаў галоўных роляў карціны.

У фільме зняліся Сяргей Шаўкуненка (Міша Палякоў), Уладзімір Дзічкоўскі (Генка Пятроў) і Ігар Шульжэнка (Слава Эльдараў). Выканаўца ролі Мішы нарадзіўся ў кінематаграфічнай сям'і: яго бацька Юрый Шаўкуненка ўзначальваў другое творчае аб'яднанне кінастудыі «Масфільм», а маці была асістэнтам рэжысёра на той жа кінастудыі. На момант здымак «Корціка» Сяргей Шаўкуненка ўжо знаходзіўся на ўліку ў дзіцячым пакоі міліцыі. Пасля заканчэння васьмі класаў Сяргей не захацеў працягваць вучобу і пасля чарговай бойкі быў накіраваны ў спецыяльнае ПТВ. Праз год пасля чарговага «залёту» атрымаў год пазбаўлення волі. Пасля адбываў розныя тэрміны за крадзяжы, захоўванне наркотыкаў і зброі, правяраўся на замешанасць у забойстве, здзяйсняў спробы ўцёкаў з-за крат. Увогуле Шаўкуненка меў пяць судзімасцяў і правёў ва ўстановах пазбаўлення волі 14,5 года. Стаў інвалідам другой групы — у турме падхапіў туберкулёз у адкрытай форме. Стварыў Масфільмаўскую арганізаваную крымінальную групіроўку, а ў 1995 годзе быў застрэлены ў сваёй кватэры разам з 76-гадовай маці.

Выканаўца ролі Генкі Уладзімір Дзічкоўскі, нягледзячы на рэкамендацыі кінастудыі, не змог паступіць у тэатральны інстытут у Мінску, працаваў звычайным кіроўцам. Ігар Шульжэнка таксама не здолеў атрымаць вышэйшую адукацыю: нягледзячы на тое, што паступаў у радыётэхнічны і політэхнічны інстытуты, вучыцца там не змог, працаваў у Мінску плітачнікам, хутка пачаў піць гарэлку, памёр у 2009 годзе.

### «ПРА ЧЫРВОНУЮ ШАПАЧКУ»

Двухсерыйны музычны тэлефільм па матывах казкі Шарля Перо рэжысёра Леаніда Нячаева. Сцэнарый Іны Веткінай — гэта працяг старой казкі пра Чырвоную Шапачку. Тэлепрэм'ера адбылася 31 снежня 1977 года. У фільме акрамя знакамітых Рыны Зялёнай, Яўгена Яўсцігнеева, Уладзіміра Басава знялася легендарная беларуская актрыса Стэфанія Станюта. А роля Чырвонай Шапачкі зрабіла знакамітай яе выканаўцу Яну Паплаўскую. 11-гадовая актрыса была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі СССР і стала адным з самых маладых яе лаўрэатаў.

— Карціна атрымалася зусім нечаканая, і мы страшна перажывалі, як дзеці яе ўспрымуць, — успамінаў Леанід Нечаеў. — Паляўнічы — подлы баязлівец, Чырвоная Шапачка адпускае ваўкоў — усё зусім не так,



як трэба! Але ўсе страхі аказаліся дарэмнымі — прынялі не горш, чым «Бураціна». І пісьмы мы атрымлівалі цэлымі мяшкамі яшчэ доўгія гады пасля прэм'еры.

Кампазітар Аляксей Рыбнікаў прыдумаў пець «Ааааа» замест «Ах» у радках песні «Здравствуйте, реки вот такой ширины, здравствуйте, горы вот такой вышины»

— Вельмі доўга мучыўся, пакуль не знайшоў гэта «Ааааа». А інакш як спец? — прыгадваў кампазітар.

**Алена КРАВЕЦ.**


## Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!

**Тэлевізары, халадзільнікі, парачкі парсючкоў, каровы, люстры, мангалы, альтанкі, трымеры, мікрахвалёўкі, наборы садовай мэблі і рыштунку, чайнікі, культыватары, прасы, шпалеры... Якіх толькі прызоў не разыгрывала найстарэйшая беларуская газета сярод сваіх падпісчыкаў! Не знайсці, як здавалася, нешта новае...**

**Але «Звязда» гэта зноў зрабіла! І, магчыма, нават здзівіла, бо 13 ліпеня сярод сваіх падпісчыкаў на трэці квартал або другое паўгоддзе разыграе сем дубовых бочак ёмістасцю 10 літраў і адну (суперпрыз) — ёмістасцю 30!**

**Для чаго іх скарыстаць, сталым чытачам газеты падказваць не трэба: ну вядома ж, для нарыхтоўкі на зіму так званай вітаміннай прадукцыі — капусты, агуркоў, грыбоў, яблыкаў, віна...**

**Да таго ж гэтымі бочкамі — як данесла «разведка» — можна проста... любавацца, бо зроблены яны сапраўднымі любанскімі майстрамі.**

**Што трэба зрабіць, каб займець — каб рэчы гэтыя выйграць?**

**Падрабязныя правілы гульні змешчаны ў нумары за 31 мая, таму зараз коратка: падпісацца на «Звязду» на трэці квартал альбо другое паўгоддзе гэтага года, запоўніць купон (яны будуць друкавацца па пятніцах), выразаць яго і да 11 ліпеня даслаць у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.**

**А ўжо далей...**

**Вам пашанцуе!**

***Тэрміны правядзення гульні — з 01.06.2018 да 30.09.2018.***

***Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3284 ад 25.05.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.***



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2018 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
**(аддзяленне сувязі)**

**на III квартал або II паўгоддзе 2018 года**

**Хатні адрас і тэлефон (абавязкова)** [          ] **(індэкс)** ________

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

# Увесь спектр эмоцый

**«ШТО РОБІЦЬ ТВАЯ ЖОНКА?»**
**«Беларусь 2», з 5 чэрвеня**



Дэтэктыў, меладрама і камедыя — у такім фармаце «тры ў адным» зроблены гэты серыял, дзе калейдаскоп будзённых падзей перамяшаны з амаль фантастычнымі прыгодамі.

Доўгі час жыццё Валерыі праходзіць па коле бясконцага дня сурка: кожную раніцу яна ўстае раней за мужа Ігара і праводзіць таго на працу ў Следчы камітэт, удзень час ад часу выконвае заказы на танную біжутэрыю, а ўвечары слухае расказы мужа пра чарговае расследаванне. Але ўсё змяняецца, калі над Ігарам завісае дамоклаў меч звальнення. Каб дапамагчы каханаму, Валерыя вырашае перакваліфікавацца з хатняй гаспадыні ў... сышчыкі. Праўда, робіць яна гэта патаемна, не карыстаючыся ніякай зброяй, акрамя ўласнай цікаўнасці і кемлівасці, — але з поспехам раскрывае нават самыя заблытаныя справы, а потым вяртаецца дадому і незаўважна спрабуе падказаць мужу, як выйсці на правільны след...

**«ЧОРНАЯ КРОЎ»**
**«Беларусь 1», з 7 чэрвеня**



Шматсерыйная меладрама сумеснай беларуска-ўкраінскай вытворчасці расказвае пра каханне — страснае, палкае і разбуральнае, якое не падпарадкоўваецца розуму і нясе з сабой боль да пакуты...

Сёстры Вольга і Ірына Котавы жывуць у ладзе ды згодзе ў невялічкай вёсачцы. Аднак гэта сямейная ідылія перастае існаваць, калі ў іх з'яўляецца новы сусед, гараджанін і прыгажун Вячаслаў, у якога закахаліся абедзве дзяўчыны. Мужчына аддае перавагу Ірыне. Але Вольга не жадае змірыцца і заказвае ў мясцовай вядзьмаркі любоўны прыварот, хоць яе і папярэджваюць, што сродак пад назвай «чорная кроў» можа прынесці шкоду ёй і родным.

**«У КОЖНАГА СВАЁ КІНО»**
**«Беларусь 3», 8 чэрвеня**



У зборнік, прысвечаны легендарнаму Федэрыка Феліні, увайшлі 34 навелы рэжысёраў з 25 краін свету. У міні-гісторыях, кожная ўсяго па 3-4 хвіліны, аўтары расказалі пра ролю кіно ў сучасным свеце.

Напрыклад, Клод Лелуш нагадаў, што ўсе рэчы на свеце, у тым ліку і любоў да кіно, пачынаюцца з сям'і. Ларс фон Трыер, які змяшаў у кароткаметражцы камедыю і трэш, рэалізаваў мару многіх гледачоў — прыбіць суседа, які перашкаджае глядзець фільм. Такешы Кітана паказаў кіно адзінокаму фермеру, а Алехандра Іньярыту выціснуў слязу фірменнай драмай... Словам, кіно пра кіно атрымалася розным, і ў гэтым — яго характство ■

## Панядзелак, 4 чэрвеня

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.05 «Зона Х». (16+).
8.40 Слова мітрапаліта Паўла на пачатак Пятроўскага поста.
8.50 Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
9.10 «Галоўны эфір».
10.20, 12.10, 18.35, 19.20 **Серыял «Добрыя намеры» (16+).**
12.40, 13.05, 15.25 **Меладрама «Жанчына ў бядзе-4». (16+).**
17.05 «Беларуская часінка».
21.00 «Панарама».
21.50 «Нашы» (6+).
22.10 **Серыял «След» (16+).**
23.45 «Арэна».
0.45 «Дзень спорту».

### Беларусь 2

7.00 «Тэлераніца» (12+).
9.00, 18.35, 22.05 «Тэлебарометр».
9.30, 20.00 **Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
10.35 «Капейка ў капейку» (12+).
11.15 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
11.55 «Спатканне для мамы». (12+).
12.55 «Свет навыварат. Непал». (16+).
13.55 М/с «Качыныя гісторыі» (0+).
15.10 Анімацыйны фільм «Мулан» (0+).
16.40 **Фэнтэзі «Піт і яго дракон» (12+).**
19.15 «Суперлато».
20.55 «Паненка-сялянка». (16+).
22.00 «КЕНО».
22.10 «Арол і рэшка. Кругасветка». (16+).
23.15 «Хадзі сюды і танцуй».
23.20 «Анжаліка». Сіткам (16+).
0.30 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Бульбяныя дзедкі.
8.05, 12.00, 19.55 Навіны культуры.
8.20, 12.15 «Гэты дзень».
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.15, 15.50 «Тайны савецкага кіно». «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (12+).
9.45 «Навукаманія» (6+).
10.15 «Музеі Беларусі».
10.40, 16.15 **«Прыгоды Электроніка». Фільм — дзецям. 1-я серыя (6+).**
12.45 «Я хачу гэта ўбачыць!» Нарач (6+).
13.10 «Наперад у мінулае».
13.40, 22.25 «Хроніка Перамогі». «Рубяжы. Араніенбаўмскі плацдарм» (12+).
14.05, 21.05 **«Па законах ваеннага часу». Маст. фільм (12+).**
15.20 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
17.30 **«Мэры Попінс, да пабачэння!» Фільм — дзецям (6+).**
20.15 «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Аляксандр Дзямідаў.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра Віктара Шавялевіча.

### Беларусь 5

6.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Іслач» (Мінскі р-н) — ФК «Смалявічы».
8.35 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
10.40 Вынікі тыдня.
11.20 Вялікі спорт.
12.00, 22.25 Тэніс. «Ралан Гарос».
14.00 Валейбол. Еўраліга.
15.45 Кубак вайны і міру. Дак. фільм.
17.10 Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Хенгела.
19.15 Час футбола.
20.00, 22.15 Спорт-цэнтр.
20.10 Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.10, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
9.10 «Контуры».
10.00 «Жыць здарова!» (12+).
11.10 «Модны прыгавор» (12+).
12.25, 13.10 **Серыял «Залатое цяля» (6+).**
13.55 «Давай пажэнімся!» (16+).
14.55 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
16.20 «Легенды цырка» (6+).
16.55 «Кантрольная закупка» (12+).
17.30, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
19.00 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 «Час».
21.10 **Серыял «Былыя» (12+).**
23.15 **Серыял «Спадары тавары́шы» (16+).**
1.15 «Начныя навіны».

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
9.00 «Тыдзень».
10.05 «Далёкія сваякі» (16+).
10.40 «Вялікае снеданне» (12+).
11.15 «Следакі» (16+).
11.40 **«Пад прыкрыццём». Серыял (16+).**
13.50 **Маст. фільм «Асцярожна, дзверы зачыняюцца!» (12+).**
15.35 «Ежа багоў» (16+).
16.50 «Вялікі горад».
17.35 «Вадзіць па-руску» (16+).
17.55, 0.35 **«Турысты». Серыял (16+).**
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 **«Белыя ваўкі». Серыял (16+).**
22.00 «Глядзець усім!» (16+).
23.05 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
23.45 «Загадкі чалавецтва» (16+).

### МІР

6.00, 8.05, 10.05, 13.15 **Серыял «Старэйшая дачка» (16+).**
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
14.00, 3.50 «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
15.00 «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 0.40 «Гульня ў кіно» (12+).
17.10 **Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
19.20 **Серыял «Джамайка» (12+).**
23.00, 0.10 **Маст. фільм «Пісталет Страдывары» (16+).**
1.35 **Маст. фільм «Акселератка» (0+).**
3.20 «Іншы свет» (12+).
4.45 **Серыял «АСА» (16+).**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Пакой смеху». (16+).
13.35 «Наша справа». (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
15.45 «60 хвілін». Ток-шоу.
17.35 «Лёс чалавека». (12+).
18.45 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
20.40 **Серыял «Падарожжа да цэнтра душы». (12+).**
22.35, 23.10 **Серыял «Скліфасоўскі». (12+).**
0.20 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10, 7.10 «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
7.50, 8.05 **Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
8.50 **Серыял «Сужэнцы». (16+).**
9.40 «За гранню». (16+).
10.20 **Маст. фільм «Хованкі». (16+).**
12.05 «Чакай мяне». (12+).
13.25, 18.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.05 **Серыял «ППС». (16+).**
15.05, 16.35 **Серыял «Ляснік». (16+).**
17.25 «ДНК». (16+).
19.45 **Серыял «Марскія д'яблы. Смерч». (16+).**
22.50 «НЗ.by».
23.10 «Вынікі дня».
23.40 **Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

7.00, 15.50, 19.40, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
7.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
7.15, 23.00 **Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
8.10 **Серыял «Дзеці Арбата» (12+).**
9.00, 19.45 **Серыял «Імператрыца Кі» (16+).**
10.05 **Прыгоды «Парк Юрскага перыяду» (12+).**
12.20 **Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
14.00 **Камедыя «Шукальнікі прыгод» (12+).**
15.55 Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
16.00 «Мультпарад» (0+).
16.10 **Серыял «Закінутыя на востраве» (12+).**
16.30 «Здароўе».
17.20 **Серыял «Анёлы» (16+).**
18.50 **Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.05 **Прыгоды «Жамчужына Ніла» (6+).**

### ВТБ

6.00, 12.10 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
6.20 «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
7.20, 4.05 М/ф «Скубі Ду». (6+)
7.50, 4.30 М/ф «Тры каты». (0+)
8.20, 4.50 М/ф «Наватары». (0+)
8.45 «Галерэя прыгажосці» (16+).
9.20 «Ад нянавісці да кахання» (16+).
10.25, 3.40 «Проста кухня» (16+).
11.00 «Шоу выхаднога дня» (16+).
13.00, 5.10 Серыял «Ранеткі». (12+).
14.00, 1.50 Серыял «Маладзёжка» (12+).
15.10 Серыял «Кухня-6» (16+).
16.15, 23.00 «Уральскія пельмені». (16+).
17.00 «Узважаныя і шчаслівыя людзі» (16+).
19.00 Серыял «Атэль «Элеон»-2» (16+).
21.10 Баявік «Рэмба: першая кроў». (16+).
0.00 Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства». (16+).
1.00 Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Легенды сусветнага кіно». Ізольда Ізвіцкая.
7.05 «Пешшу...» Масква яўрэйская.
7.35 «Архіўныя тайны». Дак. серыял.
8.05 «Антон Іванавіч сярдуе». Маст. фільм.
9.20 «Герой савецкага народа. Павел Кадачнікаў». Дак. фільм.
10.15, 18.30 «Назіральнік».
11.10 ХХ стагоддзе. «Ваш выхад». Вядучы Зіновій Герт. 1986.
12.15, 1.00 «Бедная авечка». Дак. фільм.
12.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
13.35, 0.00 «Вольга — апошняя Вялікая княгіня». Дак. фільм.
14.30 «Біблейскі сюжэт».
15.10 Легенды балета ХХ стагоддзя. «Зноў здабытыя дзённікі Ніны Вырубавай». Дак. фільм.
16.55 «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
17.25 «Агора». Ток-шоу.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Правілы жыцця».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Прыступкі цывілізацыі. «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял.
21.35 «Саці. Нясумная класіка...»
22.20 «Следчы Ціханаў». Серыял.
23.10 «Сяргей Макавецкі. У гульні!» Дак. фільм. Частка 1-я.
1.40 Спявае Барыс Хрыстоў.
2.05 «Скарбы «Прусіі». Дак. фільм.
2.45 «Pro memoria». «Азы і Вузы».

### Настальгія

6.00 «Што? Дзе? Калі?» Першы паўфінал 1982 года (12+).
7.05 Праграма «У суботу вечарам». 1986 год (12+).
8.15 Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Гумар». 1992 год (12+).
9.00 «Буй час». 2009 год (16+).
10.00 Маст. фільм «Верыш, не верыш» (16+).
11.15, 12.55, 17.05, 18.55, 21.40, 23.50, 1.00, 2.25, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
12.00 Дак. фільм «Мае сучаснікі» (12+).
13.10 Творчы вечар у канцэртнай студыі «Астанкіна». 1987 год (12+).
14.30 «Ранішняя пошта». 1989 год (12+).
15.05 Маст. фільм «Уяўны хворы» (16+).
17.15 «Музычны рынг». Гурты «Вежливый отказ» і «Джунглі». 1989 год (16+).
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ісус Хрыстос — суперзорка». 2004 год (18+).
19.20 Маст. фільм «Міраж». 1-я серыя (16+).
20.30 «Ранішняя пошта». 1985 год (12+).
21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
22.00 «Народжаная ў СССР» (12+).
23.05 «У гасцях у Мусліма Магамаева». Фрэнк Сінатра. 1992 год (12+).
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1978. 2-я частка. 2008 год (12+).
1.10 «Шынок «13 крэслаў». 1973 год (12+).
2.45 М/ф «Сустракайце бабулю» (0+).
4.00 «Колба часу» (16+).
5.30 Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі» (16+).

### EuroSport 1

4.00, 8.00, 12.00, 16.00, 20.00, 0.50, 2.30 Тэніс. «Ралан Гарос».
5.30, 11.30, 22.00, 2.00 Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
6.00, 10.35, 22.30 Тэніс. «Ралан Гарос». Матч дня.
7.00, 23.40 Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
9.30 Настольны тэніс. Сусветны тур. China Open.
0.30 Watts.

### Кінакамедыя

0.50 Сіньёр Рабінзон. (16+).
3.00 Скетчкам «Паміж намі». (16+).
3.15 Па той бок. (16+).
5.20 Дзяўчына з Манака. (16+).
7.05 З рэчамі на вылет! (16+).
8.50 Нашы палюбоўнікі. (18+).
10.30 Да чорта на рогі. (16+).
12.10 Муві 43. (18 +).
14.10 Забойны агеньчык. (16+).
16.00 Любоўны эліксір № 9. (16+).
17.50 Supeгнянь. (16+).
19.30 Асабліва небяспечная. (16+).
21.15 Гэты няёмкі момант. (16+).
23.10 Напарнік. (12+).

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.45 «10 самых» (16+).
8.15 «Доктар І...» (16+).
8.45, 19.00, 1.35 «Асколкі». Серыял (16+).
10.25, 3.05 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.05 «Асцярожна, махляры!» (16+).
12.40 «Без падману» (16+).
13.30 «Мой любімы прывід». Серыял (12+).
15.20 «Нераскрытыя тайны» (16+).
16.15 «Мой герой» (12+).
17.05 «Развітанне» (16+).
18.00 «У маёй смерці прашу вінаваціць...» Дак. фільм (12+).
20.45 «Чыста маскоўскія забойствы». Серыял (12+).
21.45 «Нераскрытыя тайны» (16+).
22.40, 4.35 «Уся Праўда» (16+).
23.10 «Грань». Серыял (16+).
0.00 «Хэнкок». Фантастыка (12+).
5.05 «Часова даступны» (12+).

### ТБ1000

6.10, 18.10 Якія не спяць у Сіэтле. (0+).
8.10 Бачнасць гневу. (16+).
10.20 Новая эра Z. (16+).
12.25 Беласнежка: помста гномаў. (12+).
14.30 Арбіта 9. (16+).
16.15 Каспер. (6+).
20.10 Доні Браска. (16+).
22.35 Авіятар. (12+).
1.50 Каралева Іспаніі. (18+).
4.10 Гатака. (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Два дні (16+).
8.15 Гітлер капут! (16+).
10.15 Русалка (16+).
12.20 Бягучая па хвалях (6+).
14.15 Прыходзь на мяне паглядзець (6+).
16.20, 4.40 Каханне не дзеліцца на два. 1—2-я серыі (12+).
18.20 Тры волаты і Шамаханская царыца (12+).
20.00 Удваіх на крызе (12+).
21.30 Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
23.05 Перакладчык. (12+).
3.00 Вясёлыя работы (12+).

### National Geographic

6.00 Цуды інжынеры. (12+).
6.45 Зона будаўніцтва. (12+).
7.40, 5.30 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
8.05, 13.25 Невераюдны доктар Пол. (16+).
8.45, 10.20, 12.40, 14.55, 3.00 Аўта-SOS. (12+).
9.35 Скарбы Тутанхамона. (12+).
11.50 Інжынерныя ідэі. (12+).
14.10 Дзікі тунец. (12+).
18.00, 21.10, 1.15, 4.40 Геній: Пікаса. (16+).
18.50 Дзіяна: згубленыя кадры. (12+).
20.45 Тайныя гісторыі. (16+).
22.50, 2.10 Марс. (12+).
23.40 Ліхтугі за мяжой. (18+).
0.30 Расследаванні авіякатастроф. (16+).

### Discovery

8.00, 17.00, 22.00, 4.40 Махінатары.
9.00, 15.00, 21.00 Як гэта зроблена?
10.00, 16.00, 23.00 Паляўнічыя на рэлiквіі.
11.00, 19.00 Інжынерныя пралікі: праца над памылкамі.
12.00 Гульня на жыццё.
13.00 Вірусы.
14.00, 7.10 Разбуральнікі легенд.
18.00 Голыя і напалоханыя.
20.00 Паляўнічыя на склады.
0.00, 3.50 Бітва за нерухомасць.
1.00 Турбадуэт.
2.00, 5.30 Самагоншчыкі.
2.55 Вулічная навука.
6.20 Хуткія і гучныя.

## Аўторак, 5 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** «Зона Х». (16+).
**8.50** Выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі (з сурдаперакладам).
**9.10, 22.20 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Добрыя намеры» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25 Серыял «Ярмолавы» (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нафтаград». Дак. фільм.
**23.55** Сфера інтарэсаў.
**0.55** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.45** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.50 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.20, 17.40 «Што робіць твая жонка?» Серыял. 1-я і 2-я серыі (16+).**
**12.25** «Паненка-сялянка». (16+).
**13.35** «Бітва салонаў». (16+).
**14.35** «Сям'я 3D». Скетчкам (12+).
**15.10, 23.00** «Анжаліка». Сіткам (16+).
**16.15, 0.00** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20, 0.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).
**20.50** «Абмен жонкамі». (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».
**22.05** «Арол і рэшка. Кругасветка». (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Верашчака.
**8.05, 12.00, 20.00** Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 20.20** «Гэты дзень».
**8.25, 18.40 «Доктар Жывага». Маст. фільм. (16+).**
**9.15, 18.15** «Тайны савецкага кіно». «Карнавал» (12+).
**9.45** «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Анатоль Кацянёў.
**10.10** «Музеі Беларусі».
**10.40** М/ф (0+).
**10.50, 17.05 «Прыгоды Электроніка». Фільм — дзецям (6+).**
**12.45** «Хата на хату».
**13.40** Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2012». «Залатая калекцыя беларускай песні».
**14.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» Налібокі (6+).
**15.25, 21.50** «Хроніка Перамогі». «Рубяжы. Абарона Карэліі» (12+).
**15.50, 21.05 «Загадана знішчыць. Аперацыя «Кітайская шкатулка». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**16.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.25** «Белавежская пушча». Арэал для людзей (6+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.15** «Люблю і памятаю». Заслужаны артыст БССР Барыс Райскі.
**23.00** «Свята далёкай зоркі». Памяці заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Эльвіры Герасімовіч.

### Беларусь 5

**7.15** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір. Хенгела.
**9.05** Піт-стоп.
**9.35** Час спорту.
**10.20, 18.30** Кубак вайны і міру. Дак. фільм.
**11.50** Спорт-мікс.
**12.00** Кікнадзе. Меркаванне.
**12.30** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
**14.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**15.00, 22.15** Тэніс. «Ралан Гарос». 1/4 фіналу.
**17.00** Легенды сусветнага спорту.
**17.30** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**18.00** Спорт-кадр.
**19.50, 22.05** Спорт-цэнтр.
**20.00** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10 Серыял «Пелагія і белы бульдог» (6+).**
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.25, 13.10 Серыял «Залатое цяля» (6+).**
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20 Камедыя «Старыя-разбойнікі» (6+).**
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Былыя» (12+).**
**23.15 Серыял «Спадары таварышы» (16+).**
**1.15** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00** «Таткаў сынок». Серыял (16+).
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.20** «Следакі» (16+).
**11.45 «Пад прыкрыццём». Серыял (16+).**
**13.50, 20.15 «Белыя ваўкі». Серыял (16+).**
**15.35** «Ежа багоў» (16+).
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.55, 1.00 «Турысты». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**21.55** «Глядзець усім!» (16+).
**23.50** «Аўтапанарама» (12+).
**0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).

### МІР

**6.00, 5.05 Серыял «АСА» (16+).**
**7.15, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Гарадскія шпіёны» (12+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 4.05** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 1.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Джамайка» (12+).**
**23.00, 0.10 Маст. фільм «Чатыры таксісты і сабака» (12+).**
**2.05 Маст. фільм «Пісталет Страдывары» (16+).**
**3.35** «Іншы свет» (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35 Серыял «Версія» (12+).**
**13.35** «Наша справа». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Падарожжа да цэнтра душы». (12+).**
**22.35, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі». (12+).**
**0.20** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.40, 22.50** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Алібі» на дваіх». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «ППС». (16+).**
**15.05, 16.35 Серыял «Ляснік». (16+).**
**17.25** «ДНК». (16+).
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч». (16+).**
**23.10** «Вынікі дня».
**23.40 Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.50, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.05 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Дзеці Арбата» (12+).**
**9.00, 19.45 Серыял «Імператрыца Кі» (16+).**
**10.05** «Майстар-клас».
**10.15** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**10.45 Прыгоды «Жамчужына Ніла» (6+).**
**12.45 Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
**14.20 Камедыя «Туз» (12+).**
**15.55** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.00** «Мультпарад» (0+).
**16.10 Серыял «Закінутыя на востраве» (12+).**
**16.30** Сад і агарод.
**17.00** «Дарога да храма. Пятроў пост».
**17.15 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.50 Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Меладрама «Чалавек і яго сабака» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Варонiны». (12+).
**7.20. 3.55** М/ф «Скубі Ду». (6+)
**7.50, 4.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.10, 4.35** М/ф «Машыны казкі». (0+)
**8.40, 4.55** М/ф «Наватары». (6+)
**9.00, 3.40** «Ералаш» (6+).
**9.20** Серыял «Ад нянавісці да кахання». (16+).
**10.25** Баявік «Рэмба: першая кроў». (18+).
**12.20** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**14.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**17.50, 23.05** «Уральскія пельмені». (16+).
**19.00** Серыял «Атэль «Элеон»-2. (16+).
**21.10** Баявік «Рэмба: першая кроў-2». (12+).
**0.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Аляксей Грыбаў.
**7.05** «Пешшу...» Масква прыбярэжная.
**7.35** «А. С. Пушкін. Тысяча радкоў пра каханне».
**8.10, 22.20** «Следчы Ціханаў». Серыял.
**9.00** «Скарбы «Прусіі». Дак. фільм.
**9.40, 19.45** «Галоўная роля».
**10.15, 18.30** «Нязіральнік».
**11.10, 0.40** XX стагоддзе. «Не дапеўшы куплета. Памяці Ігара Талькова». 1992.
**12.25** «Андрэіч». Дак. фільм.
**13.00** «Саці. Нясумная класіка...»
**13.40, 20.45** «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял.
**14.30** «Касмічная адысея. XXI стагоддзе». Дак. серыял. 1-я серыя.
**15.10** Легенды балета XX стагоддзя. «Івет Шавірэ. Ідучы за зоркай». Дак. фільм.
**16.55** «Пятае вымярэнне».
**17.20** «2 Вернік 2».
**18.05** «Тры тайны адваката Плявакі». Дак. фільм.
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.35** «Штучны адбор».
**23.10** «Сяргей Макавецкі. У гульні!» Дак. фільм.
**0.00** «Тым часам».
**1.55** Фрэдэрык Кемпф. Канцэрт у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.

### Настальгія

**6.00** Дак. фільм «Мае сучаснікі» (12+).
**6.55, 11.05, 12.55, 15.40, 17.00, 18.55, 20.25, 21.40, 23.00, 23.40, 5.15** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Творчы вечар у канцэртнай студыі «Астанкіна». 1987 год (12+).
**8.30** «Ранішняя пошта». 1989 год (12+).
**9.05** Маст. фільм «Уяўны хворы» (16+).
**11.15** «Музычны рынг». Гурты «Вежливый отказ» і «Джунглі». 1989 год (16+).
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ісус Хрыстос — суперзорка». 2004 год (18+).
**13.20, 19.20** Маст. фільм «Міраж» (16+).
**14.30** «Ранішняя пошта». 1985 год (12+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**17.05** «У гасцях у Мусліма Магамаева». Фрэнк Сінатра. 1992 год (12+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Іншае жыццё: МПЗ». 2007 год (12+).
**23.30** «Сядзі і глядзі» (16+).
**0.00** «Што? Дзе? Калі?» Першы паўфінал 1982 года (12+).
**1.05** Праграма «У суботу вечарам». 1986 год (12+).
**2.15** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Гумар». 1992 год (12+).
**3.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**4.00** Маст. фільм «Верыш, не верыш» (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 8.00, 13.00, 15.00, 18.15, 0.50, 2.30** Тэніс. «Ралан Гарос».
**5.30, 11.30, 21.00, 2.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**6.00, 11.00, 21.30** Тэніс. «Ралан Гарос». Матч дня.
**7.00, 12.00, 22.30** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**9.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**10.35** Стральба з лука. Кубак свету.
**14.30, 18.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
**23.30** «Найлепшае з коннага спорту».
**0.05** Аўтагонкі. Формула Е.
**0.30** Аўтагонкі. Серыя Blancpain Endurance.
**1.30** Ралі. ERC. «All Access».

### Кінакамедыя

**1.00** Ушчэнт. (16+).
**2.45** Уладары сноў. (16+).
**4.15** Беласнежка: помста гномаў. (12+).
**6.10** Платон. (16+).
**8.00** Неадэкватныя людзі. (16+).
**10.05** Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець. (16+).
**12.10** Асабліва небяспечная. (16+).
**14.05** Голая праўда. (16+).
**15.55** Гэты няёмкі момант. (16+).
**17.45** Superнянь-2. (16+).
**19.30** Superперцы. (16+).
**21.35** Дзетародныя. (16+).
**23.20** Руская гульня. (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.05** «Доктар І...» (16+).
**8.35, 19.00, 1.50** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 3.20** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**13.00, 16.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**14.55** «Простыя складанасці» (12+).
**15.25** «Натуральны адбор» (12+).
**20.45** «Чыста маскоўскія забойствы». Серыял (12+).
**21.45, 4.50** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**22.35, 5.35** «Вокладка» (16+).
**23.05** «Грань». Серыял (16+).
**23.55** «Самалёт прэзідэнта». Баявік (16+).

### TV 1000 ТБ1000

**6.10, 18.05** Як украсці хмарачос. (12+).
**8.15** Доні Браска. (16+).
**10.50** Авіятар. (12+).
**14.10** Хаціко — самы верны сябар. (6+).
**16.00** Гатака. (12+).
**20.10** Чарлі і шакаладная фабрыка. (12+).
**22.25** Каханне жыве тры гады. (16+).
**0.20** Персанаж. (12+).
**2.25** Галаграма для караля. (18+).
**4.05** Успомніць усё. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Перакладчык. (12+).
**10.20** Уцячы, дагнаць, заказаць (12+).
**12.00** Вуліца Ньютана, дом 1 (6+).
**14.00** Населены востраў (12+).
**16.20, 4.30** Каханне не дзеліцца на два. (12+).
**18.20** Тры волаты на далёкіх берагах (0+).
**20.20** Прыцягненне (12+).
**22.35** Ванечка (16+).
**0.40** Дзень дурня (16+).
**2.30** Цяжка быць мача (16+).

### National Geographic

**6.00** Цуды інжынерыі. (12+).
**6.45** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.35, 13.15** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25, 12.30, 16.25, 20.25, 2.50** Аўта-SOS. (12+).
**9.10, 14.45, 22.50** Геній: Пікаса. (16+).
**11.45** Непаражальныя канструкцыі. (12+).
**14.00** Дзікі тунец. (12+).
**18.00, 22.00, 1.15, 4.20** Экстрэмальны футбол у Расіі. (12+).
**18.50** Аперацыя «Каралеўскае вяселле». (12+).
**19.40, 0.25** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**23.40** Ліхтугі за мяжой. (18+).
**2.00** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас. (16+).
**5.10** Інжынерныя ідэі. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.00, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.00, 19.00** Інжынерныя пралікі: праца над памылкамі.
**12.00** Гульня на жыццё.
**13.00** Адам псуе ўсё.
**14.00, 7.10** Разбуральнікі легенд.
**18.00** Турбадуэт.
**20.00** Паляўнічыя на склады.
**0.00, 3.50** Бітва за нерухомасць.
**1.00** Выжыць у цемры.
**2.00, 5.30** Самагоншчыкі.
**2.55** Эд Стафард: які выжыў.
**6.20** Хуткія і гучныя.




## Цень ад гмаху на ўвесь свет

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» віктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**гмах** — вялікі вышынны будынак;
**бабыль** (адно са значэнняў) — адзінокі, бессямейны чалавек;
**летуцець** — аддавацца марам, марыць;
**наканаваць** — загадзя вызначыць, абумовіць што-небудзь;
**цырата** — тканіна, пакрытая з аднаго боку саставам, які робіць яе непрамакальнай;
**крахаль** — вадаплаўная птушка сямейства качыных;
**клёпкі не хапае** — так гавораць пра чалавека неразумнага, з дзівацтвамі (беларусы яшчэ скажуць: *мякіна ў галаве, дурны поп хрысціў*; рускія: *сдвиг по фазе, мозги набекрень*);
**на ўвесь свет** — 1) вельмі моцна, гучна крычаць, лаяцца; 2) перад усімі людзьмі (абняславіць) (беларускія адпаведнікі: *благім матам, не сваім голасам*; рускія: *во всю ивановскую, во всё горло*).

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Тэлесеткі

### ВА ЎСІХ НА ВАЧАХ

**У праграме «Наша раніца» на канале АНТ з'явілася новая рубрыка «Пераўтварэнне». У яе рамках людзі рознага полу, узросту і сацыяльнага статусу змяняюць штосьці ў сабе: з дапамогай спецыялістаў асвяжаюць гардэроб, падбіраюць новую прычоску і стыль, нарэшце, праходзяць псіхалагічную разгрузку.**

Адным з першых герояў рубрыкі стаў вядомы сіноптык і тэлевядучы Дзмітрый Рабаў, які змяніў офіснае крэсла на трэнажорную залу і эксперыментаваў са стылем.

На сёння, як расказала «Звяздзе» аўтар і вядучая рубрыкі Марына Эльяшэвіч, у «лісце чакання» на пераўтварэнне ўжо некалькі дзесяткаў чалавек: «Героі вельмі розныя: ёсць дзяўчына-спартсменка, ёсць кіроўца трамвая, студэнты, якія хочуць змяніць імідж пасля ВНУ на больш сталы... Безумоўна, ёсць і людзі старэйшага пакалення — нездарма гавораць, што на пенсіі жыццё не канчаецца, а толькі пачынаецца, і для гэтага таксама часам патрэбнае абнаўленне. Што менавіта варта змяніць чалавеку для большай упэўненасці ў сабе, мы вырашаем разам з ім і экспертамі: камусьці трэба падабраць іншае адзенне, камусьці — звярнуць больш увагі на фізічны стан; але галоўнае, што ў выніку гэтых перамены паляпшаюць якасць жыцця».

Таксама хочаце змяніць штосьці ў сабе? Тады пішыце на электронную пошту utro@ont.by або афіцыйныя суполкі праграмы ў сацыяльных сетках. Рубрыка выходзіць у «Нашай раніцы» штотыднёва — і як мінімум да канца лета.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**



*(Заканчэнне. Пачатак на 1, 4–й стар. «МС».)*

тур так, каб вандроўнікі вярталіся на начлег у сталіцу ці буйныя абласныя цэнтры, што не заўсёды зручна.

Часам менавіта дробязі здольныя сапсаваць уражанне турыстаў ад наведвання краіны. Так, падчас чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе ўзнікла нечаканая на першы погляд праблема — недахоп месцаў для парковак. Напрыклад, у Нясвіжы госці паркаваліся ў дварах жылых дамоў, таму што ў горадзе такой магчымасці не было.

> Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежская пушча, Геадэзічная дуга Струвэ сёння з'яўляюцца аднымі з самых наведвальных месцаў у Беларусі і ўваходзяць практычна ў кожную турыстычную праграму.

Сутыкнуліся людзі і з чэргамі ў пункты абмену валюты. Самымі незадаволенымі ў гэтай сітуацыі аказаліся мясцовыя жыхары, якім даводзілася марнаваць час для таго, каб ажыццявіць патрэбныя плацяжы.

Варта паклапаціцца і пра сувенірную прадукцыю, якая павінна быць добрай якасці і розных коштавых катэгорый, каб кожны мог прывезці частку Беларусі да сябе на радзіму.

Яшчэ адной істотнай праблемай Беларусі турыстычнай з'яўляецца недахоп дарожнай навігацыі. Сёння вялікая частка еўрапейскіх турыстаў аддае перавагу падарожжам на ўласных аўтамабілях, а паказальнікі на трасах і ў гарадах часта напісаны на кірыліцы, вельмі складанай для разумення замежнікаў.

Істотным мінусам з'яўляецца і тое, што самі беларусы не так часта падарожнічаюць па сваёй краіне. «Ва ўсім свеце ёсць такая заканамернасць: замежнікі пачынаюць ездзіць у краіну тады, калі па ёй падарожнічаюць суайчыннікі, ад гэтай формулы нікуды не падзецца і нам. Калі самі грамадзяне пачынаюць ездзіць па сваёй краіне, тут хутчэй з'яўляюцца аб'екты інфраструктуры, пункты харчавання і размяшчэння, ад гасцініц высокага ўзроўню да хостэлаў. Усё гэта прымушае ўлады рэгіёнаў акультурваць тэрыторыю, аднаўляць аб'екты, якія могуць быць цікавыя ў плане архітэктурна-гістарычнай спадчыны. А далей пра цікавыя месцы Беларусі даведваюцца і госці, напрыклад праз сацыяльныя сеткі», — адзначае Марына Масташова.

## Праца не з лёгкіх

У нас працуюць вельмі добрыя спецыялісты — экскурсаводы і гіды-перакладчыкі. Нягледзячы на тое, што помнікаў архітэктуры тут, можа быць, не так шмат, як у іншых еўрапейскіх краінах, яны здольныя па-сапраўднаму ўлюбіць турыста ў Беларусь. Многія гіды-перакладчыкі, працуючы з замежнымі турыстамі, адзначаюць, як змяняецца ўспрыманне нашай краіны і ўражанні ад яе. Ужо больш за 10 гадоў для паляпшэння якасці абслугоўвання турыстаў у нас існуе сістэма прафесійнай атэстацыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, цяпер атэстацыю маюць 1067 чалавек. Нашы спецыялісты ў большасці сваёй з'яўляюцца прадаўжальнікамі беларускай экскурсійнай школы, якая была адной з найлепшых у СССР. Хоць, як вядома, мяжы дасканаласці няма. Наогул, працаваць з людзьмі заўсёды няпроста. На турыстычным маршруце часам узнікае маса пытанняў, якія неабходна вырашаць. У гэтую прафесію трапляе далёка не кожны, а застаецца на доўгія гады тым больш...

> Па стане на 24.05.2018 магчымасці, якія дае Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян», скарысталіся 113 230 чалавек з 68 краін свету (у тым ліку 457 асоб без грамадзянства).

Відавочна, што Беларусь, знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, мае шмат краін-канкурэнтаў у турыстычным плане. У кагосьці больш помнікаў, у кагосьці багацейшыя прыродныя рэсурсы. Таму ў нас павінна быць велізарная матывацыя, каб працягваць развівацца і шукаць свае цікавінкі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

КАМПЕТЭНТНА

# НАМ ПАТРЭБЕН ІНТАРЭС ДА САМІХ СЯБЕ

### Для краіны без мора ўклад турызму ў эканоміку не малы, але мог бы быць большы

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА апошнім часам актыўна ўключана ў тэму турызму. Толькі ў маі яна ўзначаліла значнае мерапрыемства ў гэтай сферы ў парламенце і выступіла з дакладам пра развіццё турызму ў нашай краіне на міжнароднай пляцоўцы. Тэма маладзёжнага турызму будзе абмяркоўвацца і на адной з секцый у рамках V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі восенню гэтага года. Сенатар стане адным з мадэратараў абмеркавання. Думкі заканадаўцы пра тое, як Беларусь пераўтвараецца ў пункт прыцягнення для замежных гасцей і для саміх беларусаў, даведалася «МС».**

***— Ірына Анатольеўна, калі гадоў 25 таму я ўпершыню пачула разважанні пра турызм у Беларусі, мне гэта падалося чымсьці ўтапічным. Які турызм? Мора няма, гор няма, значная частка гістарычнай спадчыны страчана... Але цяпер мы гутарым з вамі пра гэта ў сценах верхняй палаты парламента.***

— Больш за тое, сёння пытанні развіцця турыстычнай сферы абмяркоўваюцца не толькі ў рамках нашай краіны, але і на міжнароднай прасторы. Нядаўна дэлегацыя Беларусі ўдзельнічала ў пасяджэнні Парламенцкага камітэта парламенцкага вымярэння Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы ў Заграбе. Там якраз абмяркоўвалі ролю парламентарыяў у развіцці ўстойлівага турызму. На пасяджэнні былі таксама прадстаўнікі Балгарыі, Польшчы, Аўстрыі, Сербіі, Румыніі, Славакіі, Украіны, Чарнагорыі, Македоніі. Для членаў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы такія сустрэчы — магчымасць убачыць дасягненні іншых краін, пабудаваць новыя партнёрскія сувязі і садзейнічаць ідэі сумяшчальнасці ў Вялікай Еўропе.

***— Гэта значыць, што цяпер мы абмяркоўваем развіццё турызму на роўных з краінамі, якія маюць выхад да мора і могуць пахваліцца горамі?***

— Так. Ідэя ўстойлівага турызму заключаецца ў тым, каб развіваць эканамічны, сацыяльны, эстэтычны складнікі гэтай сферы, захоўваючы пры гэтым экалагічную і культурную цэласнасці, біяразнастайнасць. Прадукцыя ўстойлівага турызму не павінна разбураць асаблівасці мясцовага асяроддзя, самабытнасць народа, які жыве на гэтай тэрыторыі. Адпаведна, важна пазбягаць негатыўнага ўплыву пры будаўніцтве інфраструктуры.

> Турызм мусіць быць эканамічна жыццядзейны. Ён павінен задавальняць патрэбы грамадства і пры гэтым захоўваць культурную спадчыну і прыроднае багацце. Таму развіццё гэтага бізнесу павінна ісці поруч з развіццём рэгіёна, мясцовай супольнасці. Гэта мае значэнне для ўсяго свету.



***— Як кажуць сёння, мы трапілі ў трэнд.***

— Я вам больш скажу: мы з'яўляемся актыўнымі ўдзельнікамі працэсу. Паняцце ўстойлівага турызму не новае для нашай краіны. Аграэкатурызм, пра які ведае кожны беларус, заснаваны на прынцыпах ашчаднага стаўлення да навакольнага асяроддзя і на ідэі ўдзелу мясцовага насельніцтва. Аграэкатурызм у Беларусі спрыяе эканамічнаму пад'ёму сельскіх тэрыторый, бо гэта і стварэнне новых рабочых месцаў, і так званы зялёны кірунак, які адпавядае крытэрыям устойлівасці.

Развіццю аграэкатурызму садзейнічае прававая база нашай краіны, якая адпавядае агульнасусветным патрабаванням. Ёсць указ Прэзідэнта, згодна з якім арганізацыя турыстычных вандровак унутры Беларусі вызвалена ад падатку на дабаўленую вартасць. Распрацавана дзяржаўная праграма «Беларусь гасцінная». У ёй вызначаны мэты — фарміраванне і развіццё канкурэнтаздольнага турыстычнага комплексу, павелічэнне ўкладу турызму ў нацыянальную эканоміку. Прыярытэтнымі названы ўязны і ўнутраны турызм, дыверсіфікацыя і рост аб'ёмаў экспарту турыстычных паслуг.

У дэбатах на палях Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы мы казалі пра вялікія магчымасці далейшага супрацоўніцтва ў гэтай сферы. Напрыклад, бязвізавым парадкам наведвання Беларусі праз Нацыянальны аэрапорт Мінск скарысталіся амаль 97 тысяч грамадзян з 68 краін. Колькасць арганізаваных турыстаў, якія наведалі нашу краіну ў 2017 годзе, вырасла ў параўнанні з папярэднім годам на 30 % і склала больш за 282 тысячы чалавек.

Мяркую, Беларусь турыстычная павінна больш гучна заяўляць пра сябе ў свеце.

***— Як вы лічыце, на якім этапе свайго жыццёвага цыкла знаходзіцца аграэкатурызм у нашай краіне?***

— Упэўнена, што патэнцыял росту тут яшчэ далёка не вычарпаны. Колькасць сядзіб працягвае расці. Аграэкатурызм цікавы тым, што заснаваны на мясцовых традыцыях. Вельмі важны культурны аспект захавання гэтых традыцый, і ў гэтым кірунку робіцца шмат.

***— Уклад турыстычнай галіны ў эканоміку ўжо адчуваецца? Ці гэта тэма будучыні?***

— Доля сферы турызму ў ВУП складае 1,8 %. Гэта не мала, пры ўмове, што мы не маем мора і гор, але доля гэта можа быць большай.

Каб вызначыць, што нам патрэбна яшчэ зрабіць для развіцця гэтай сферы, мы ў маі ў Савеце Рэспублікі праводзілі пашыранае пасяджэнне секцыі навукова-кансультацыйнага савета. У абмеркаванні ўзялі ўдзел не толькі сенатары, але і прадстаўнікі міністэрстваў спорту і турызму, адукацыі, аховы здароўя, устаноў адукацыі, грамадскіх аб'яднанняў. Удзельнікі адзначылі шэраг эфектыўных мер, якія былі прынятыя для развіцця турызму ў нашай краіне. Разам з тым рэалізацыя гэтых мер не з'яўляецца поўнай, што не дазваляе турызму выконваць больш істотную ролю ў эканоміцы Беларусі.

Сярод праблем, якія негатыўна ўплываюць на развіццё турыстычнай галіны, былі названы нізкая зацікаўленасць суб'ектаў турыстычнай дзейнасці ў арганізацыі ўнутранага і ўязнога турызму. Дагэтуль не распрацаваны брэнд краіны, які абмяркоўваецца з 2010 года. Рух ёсць, і мы спадзяёмся, што ў хуткім часе нейкі варыянт зможам убачыць і ацаніць. Было б здорава, каб грамадскасць магла разглядзець розныя варыянты брэнда нашай краіны.

> Недастатковыя намаганні прыкладаюць мясцовыя органы ўлады для прасоўвання ўнутранага турызму. Губляюць актуальнасць некаторыя адпаведныя сайты.

Удзельнікі пасяджэння адзначылі неабходнасць стварэння якаснай турыстычнай інфраструктуры на тэрыторыях бязвізавага знаходжання, напаўнення календара падзеямі міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўняў, прасоўвання турыстычных магчымасцяў гэтых тэрыторый.

Неабходна пастаянна аналізаваць і сістэму падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў сферы турызму, працаўладкавання выпускнікоў установ адукацыі.

Турыстычны патэнцыял Беларусі базіруецца на разнастайнасці і прыгажосці яе прыроды, унікальнасці гісторыка-культурнай спадчыны. У нашай краіне больш за 15 тысяч аб'ектаў, якія маюць культурнае, гістарычнае, археалагічнае значэнне. Гэта мясціны, якія звязаны з імёнамі выдатных дзеячаў сусветнай гісторыі і культуры. На тэрыторыі Беларусі размешчана значная колькасць гістарычных гарадоў: Полацк, Гродна, Нясвіж і іншыя. У нас ёсць чатыры нацыянальныя паркі. Кожны крок, кожнае месца ў Беларусі мае гістарычную каштоўнасць.

Калі ў першую чаргу ў нас будзе інтарэс да саміх сябе, то будзе і зацікаўленасць да нас з боку замежнікаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

МЕРКАВАННІ

# ЗАПРАШАЕМ У БЕЛАРУСЬ!

**У нашай краіне няма сапраўдных гор і мора, але калі паразважаць, то па гэта не трэба ехаць за мяжу. Мора беларусам замяняюць Браслаўскія азёры, горы — салігорскія тэрыконы. Вежы і палацы, якія засталіся ў спадчыну, не саступаюць у веліччасці і прыгажосці архітэктурным шэдэўрам галоўных еўрапейскіх сталіц. Беларусь мае рэсурсы для развіцця турыстычнага патэнцыялу, але ў які бок для гэтага трэба рухацца?**

**Мікалай КРАСОЎСКІ, старшыня Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Упор трэба рабіць на бязвізавы рэжым. Ён у нас існуе. Наведваць тэрыторыю турыстычна-рэкрэацыйнай зоны «Брэст» без візы можна да 10 дзён. Гэтыя правілы пачалі дзейнічаць з 1 студзеня. Мы вядзём штотыднёвую статыстыку па колькасці турыстаў, якія, згодна з правіламі, прыбываюць да нас. Прыехала ўжо больш за 3500 гасцей.

Цікавым рэсурсам з'яўляецца і інвестыцыйная прывабнасць Брэста. Яна абумоўлена святкаваннем 1000-годдзя горада, якое мае адбыцца. Мы разлічваем, што вядомасць рэгіёна ў рамках падрыхтоўкі да свята, правядзення мерапрыемстваў і інфармавання пра гэта на міжнародным узроўні будзе спрыяць турыстычнаму патэнцыялу. Вядома, прыцягваюць замежных гасцей (асноўная колькасць — расіяне) у першую чаргу нашы брэнды — Брэсцкая крэпасць, Белавежская пушча. Аграэкатурызм больш характэрны для раёнаў — Брэсцкага, Камянецкага. Яны таксама размешчаны ў зоне бязвізавага доступу.

**Валянціна КРУПЦА, гаспадыня аграсядзібы, Быхаўскі раён:**

— Для развіцця аграсядзібнага бізнесу вялікае значэнне мае асоба гаспадара. У першую чаргу ён павінен быць энергічны і цярплівы: усё ж такі гэта работа з людзьмі. Каб прыцягнуць кліента, уладальнікі маёнткаў павінны ўдзельнічаць у рабоце. Ведаю некаторых суседзяў, гаспадароў сядзіб, якія толькі збіраюць грошы. Але якасна і аддана чужыя людзі на вёсцы працаваць не будуць. Бываюць прыкрыя выпадкі, калі госці, напрыклад расіяне, дамаўляюцца, прыязджаюць, але не могуць нават размясціцца — усяму віной бездакладнасць гаспадароў. Дзякуй богу, гэта адзіныя выпадкі, але яны ёсць.

На папулярнасць сядзібы ўплывае і месца яе размяшчэння. Мы знаходзімся на беразе вадасховішча. Людзі могуць лавіць рыбу, бавіць час, катаючыся на катамаране, водных лыжах, катары. Многа чаго можна прыдумаць, таму важны рэсурс — крэатыўнасць гаспадара. Трэба развіваць і актыўны адпачынак: ёсць пляцоўка для міні-футбола, валейбола, спартыўны гарадок.

Асноўныя госці апошнім часам — беларусы. Рада, што нашы людзі могуць сабе дазволіць выехаць на прыроду. Праўда, хачу адзначыць як прадпрымальніца: хацелася б большай увагі да нас і нашых праблем з боку мясцовых улад.

**Марына ГНЯДАЯ, дырэктар беларускага турапаратара прыватнага навукова-практычнага ўнітарнага прадпрыемства «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму»:**

— У першую чаргу трэба адзначыць патэнцыял нашых санаторыяў. А цяпер выдатныя суадносіны цаны і якасці. Санаторыі вельмі папулярныя сярод замежных грамадзян. Іншаземцы гатовыя ехаць на лячэнне, аздараўленне ў Беларусь. Але на сёння тэрмін бязвізавага рэжыму праз Нацыянальны аэрапорт складае толькі 5 дзён, а гэтага вельмі мала для лячэння. Каб атрымаць эфект для здароўя, неабходна павялічыць колькасць дзён знаходжання па бязвізавым рэжыме да 10—14.

Калі казаць пра пазнавальны турызм, то для яго развіцця неабходна папулярызацыя Беларусі не толькі на міжнароднай арэне, але і сярод нашых грамадзян, падлеткаў. Важная задача — захаванне гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

Яшчэ адзначу, што ў нас мала атэставаных гідаў-перакладчыкаў. Гэта актуальна асабліва цяпер, калі кожны гід павінен атэставацца па кожнай экскурсіі асобна. Існуе ў горадзе Мінску праблема і са стаянкамі для экскурсійных аўтобусаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

ПАЕХАЛІ!

# УІК-ЭНД У БЯЗВІЗАВАЙ ЗОНЕ

## За што гатовы плаціць замежныя турысты?

**ЛЕТАСЬ Гродна і яго наваколле наведала звыш 52 тысяч бязвізавых турыстаў. Яны пакінулі ў рэгіёне больш за 12 мільёнаў еўра. У сярэднім атрымліваецца 220 еўра на чалавека. Але ці ўсе магчымасці задзейнічаны, каб прымусіць замежнага турыста «раскашэліцца»?**

### БЯЗВІЗ — НА ВЫХАДНЫЯ

З пачатку гэтага года бязвізавы паток яшчэ вырас. За квартал прыбыло 20 тысяч турыстаў. Гэта амаль удвая больш, чым за такі ж перыяд мінулага года. І хоць сярод гасцей — прадстаўнікі 42 краін свету, пераважная большасць — гэта найбліжэйшыя суседзі, у асноўным літоўцы і палякі. Шлях ад іх недалёкі, таму і тэрмін знаходжання невялікі. Як правіла, бязвізавыя турысты прыязджаюць альбо на адзін дзень, альбо на ўік-энд. А чым меншы тэрмін, тым менш і грошай яны патрацяць.

Многія наведваюць Гродна ўпершыню. Па словах **дырэктара гродзенскай турыстычнай фірмы «Зэт» Сяргея ЯКШЭВІЧА**, некаторыя прыязджаюць «у разведку». А праз некаторы час вяртаюцца разам з групамі і могуць затрымацца на выхадныя. Выгаду адчулі і турагенцтвы — іх колькасць значна павялічылася. Але канкурэнцыя ў гэтай справе турысту толькі на карысць. Сёлета фірма «Зэт» разам з польскімі партнёрамі арганізавала дастаўку турыстаў са спрошчанага пункта пропуску. Да пагранпераходу групу турыстаў падвозяць палякі, а на пешым пераходзе праз Аўгустоўскі канал з беларускага боку іх сустракае транспарт гродзенскай турфірмы.

— Наша задача — за мінімум часу, гэта значыць за выхадныя, паказаць як мага больш цікавага ў горадзе і наваколлі. Самымі папулярнымі аб'ектамі, як заўсёды, з'яўляюцца Каложа і замкі, домік пісьменніцы Элізы Ажэшкі, агратурыстычны комплекс «Каробчыцы». Зараз, з адкрыццём сезона, ёсць магчымасць пакатацца на цеплаходзе па Нёмане і Аўгустоўскім канале. Па бязвізе перавезлі больш за 2 тысячы турыстаў.

«Загрузіць» 2-3 дні цікавай праграмай не праблема, упэўнены дырэктар. А вось далей турыста цяжка затрымаць на адным месцы. Таму многія госці па-ранейшаму аддаюць перавагу візавай сістэме, каб мець магчымасць ехаць далей па Беларусі.

### ЁСЦЬ ДЗЕ ПАСПАЦЬ І ПАЕСЦІ

Дарэчы, многія турыстычныя фірмы з увядзеннем бязвізавай зоны змянілі кірунак дзейнасці. Калі напачатку ўнутраным турызмам займалася ўсяго некалькі агенцтваў, то зараз іх каля 70. Турысты, якія зацікаўлены ў больш трывалым знаёмстве з Беларуссю, як ужо адзначалася, прыязджаюць з візай. Гэта пацвярджае і экскурсавод Ганна Шарэнда. Шырокім попытам у польскіх турыстаў карыстаюцца маршруты, звязаныя з агульнай гісторыяй. Яны едуць з Гродна ў Навагрудак, Пінск, наведваюць радзіму спевака Чэслава Немана на Шчучыншчыне, Брэст.

> Бязвіз жа зрабіў значны ўнёсак у развіцце самога абласнога цэнтра. Адкрываюцца новыя кавярні і рэстараны, кіёскі з сувенірамі, вырасла цэлая вуліца рамеснікаў.



Фота Алы БЯЛОВАЙ.

Цеплаход з польскімі турыстамі на Нёмане.

У Гродне з'явіліся новыя гасцініцы, атэль-апартаменты, адкрыта некалькі хостэлаў. Створана 400 працоўных месцаў. Толькі за першы квартал года з'явілася некалькі харчовых аб'ектаў на 200 месцаў. Плануецца адкрыць яшчэ тры хостэлы, і гэта невыпадкова: попыт на спальныя месцы ў горадзе павялічваецца. Падлічана, што палову сродкаў, якія трацяць у рэгіёне бязвізавыя турысты, складае менавіта аплата месцаў пражывання. А вось кваліфікаваныя экскурсаводы — гэта тое, што можна назваць упушчанай выгадай. Спецыялістаў з веданнем польскай, англійскай, нямецкай моў па-ранейшаму недастаткова, лічыць Ганна Шарэнда. Таму многія фірмы прыязджаюць са сваімі экскурсаводамі. Праўда, індывідуальныя турысты ходзяць з картамі і маюць магчымасць з дапамогай смартфонаў «чытаць» інфармацыю з QR-кодаў на аб'ектах горада.

### ДЭПУТАТАЎ ЗАЦІКАВІЛА ІНФРАСТРУКТУРА

Ацаніць турыстычную абстаноўку на месцы вырашылі дэпутаты гарсавета — падчас выязной сесіі. Мэтай наведвання сталі Аўгустоўскі канал і навакольная інфраструктура. Гэта вельмі важны ўчастак для бязвізавых турыстаў, падкрэсліў дэпутат Гродзенскага гарсавета, **намеснік старшыні абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Сяргей КАЛЯДА.** На канале дзейнічае сезонны водна-пешавелазіпедны пункт пропуску. Сюды прыбываюць турысты на веласіпедах і байдарках, праходзяць пешыя групы. Уладкаваннем веламаршрутаў тут заняліся некалькі гадоў таму. Нядаўна створаны і прамаркіраваны маршрут «Па слядах яцвягаў», які доўжыцца 40 кіламетраў паўз канал. На яго працягу ўсталявана 15 месцаў адпачынку з інфармацыйнымі шыльдамі.

— Маршрут у некалькіх месцах перасякае канал, праходзіць па цудоўных маляўнічых мясцінах, удала ўпісаны ў прыродны ландшафт, — расказвае Сяргей Каляда. — Можна праехаць яго часткова, закальцаваць у патрэбным месцы. Многія турысты з Польшчы асвойваюць беларускі бок канала, прыязджаюць на веласіпедах. Хто мае патрэбу, можа спыніцца ў аграсядзібе. Іх тут дастаткова.

За некалькі кіламетраў ад канала стаіць Гродзенская крэпасць. Форты крэпасці маюць статус гістарычнай каштоўнасці, нядаўна з'явілася магчымасць для іх наведвання.

Важным крокам стала пракладка дарогі да самага вялікага форта, які быў узведзены напярэдадні Першай сусветнай вайны і не мае аналагаў у Беларусі. Яго называюць апошнім фарпостам Расійскай імперыі. Сапраўды, сюды наведваўся сам імператар Мікалай II разам са сваёй сям'ёй. Зараз тут выдаюць ахвотным спецыяльныя ліхтары, каб можна было паблукаць па падземных сховішчах.

Па словах дэпутата, важна развіваць актыўны адпачынак. У свеце, асабліва ў Еўропе, на веласіпедах і байдарках вандруюць цэлымі сем'ямі. Гродна, які знаходзіцца паміж польскім Аўгустовам і літоўскім горадам-курортам Друскінінкай, можа стаць важным звяном для трансграннічных вандровак. А гэта яшчэ адзін крок да павелічэння колькасці турыстаў. Вось толькі «раскашэліцца» ім на канале няма дзе. Хіба што падчас выхадных, калі на адным са шлюзаў часам ладзяцца святы...

### А ЯК З РЭКЛАМАЙ?

Увесь сэрвіс — ад пражывання да забаўляльнай праграмы — забяспечвае турагенцтва. Марыўш, бізнесмен з Польшчы, расказаў, што ён прыехаў у Гродна з групай у складзе 14 чалавек. Гэта дзелавыя людзі з Аўгустова і Варшавы. Марыўш не першы раз у Гродне і вырашыў паказаць горад сваім партнёрам. Па яго словах, наведванне рэгіёна з адпаведнай праграмай абыходзіцца значна танней, чым, напрыклад, у Еўропе.

Турыстам з Польшчы спадабалася катанне на цеплаходзе па Нёмане, беларускую кухню з дранікамі, наведванне агратурыстычнага комплексу «Каробчыцы», экскурсію па горадзе. Са свайго боку польскія турысты выказалі меркаванні наконт патэнцыялу рэгіёна. На іх думку, галоўная прывабнасць Гродзеншчыны і ўсёй краіны — гэта прырода.

— Сюды можна прыцягнуць турыстаў з усяго свету — менавіта хараством прыроды, адпачынкам на азёрах і рэках... Патэнцыял бязвізавай зоны вялікі, але ён выкарыстоўваецца недастаткова, — лічыць Марыўш.

Не шмат і рэкламы за мяжой. Між тым многім турыстам з Польшчы адпачынак прыйшоўся па душы. Яны адчуваюць гасціннасць беларусаў і, што важна, бяспеку.

> Дарэчы, што датычыцца рэкламы, ужо ёсць дамоўленасць гарадскіх улад з польскім бокам аб установцы ў Беластоку і Аўгустове білбордаў пра бязвізавую зону. Такая прапанова накіравана і ў літоўскі Друскінінкай.

— Вопыт паказаў, што на турызме можна зарабляць. Таму ў рэгіёне распрацавана праграма па ўдасканаленні турыстычнага сэрвісу ў Гродне і Гродзенскім раёне на наступныя два гады. Звяртаецца ўвага на развіццё інфраструктуры, правядзенне маркетынгавых мерапрыемстваў, стварэнне ўмоў для малога і сярэдняга бізнесу, — расказаў Сяргей Каляда. — Усё гэта павінна даць штуршок да росту турыстычнага прадукту.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

НА СВАЕ ВОЧЫ

# УСІМ СЫРАМ СЫР!

## Як у Слаўгарадзе насельніцтва знайшло сабе прыбытковы занятак і стварыла гастранамічны фестываль

**Гэтым разам асабліва пашчасціла з надвор'ем. Сонейка, блакітнае неба, а над галоўнай пляцоўкай фестывалю каля раённага Цэнтра культуры плывуць прыемныя пахі... І на гэтыя пахі як пчолы на мёд бясконца збіраюцца людзі. Чарга ў палатку сыравараў знікла толькі тады, калі аб'явілі: «Прабачце, даражэнькія, сыру больш няма!». Такім чынам, у мінулую суботу фестываль «Гаспадарчы сыр» прайшоў у Слаўгарадзе ўжо сёмы раз.**

### БЕЗ ФАРБАВАЛЬНІКАЎ І КАНСЕРВАНТАЎ

Галоўныя героі свята — гэта жывы прыклад таго, як з маленькай ініцыятывы можа нарадзіцца вялікая справа. Сёння ў калектыў «Гіжэнскі аграрый» уваходзяць 15 сыравараў. Яшчэ 15 існуюць аўтаномна. Але гэта не перашкаджае ім на час знакавых мерапрыемстваў аб'ядноўваць свае высілкі.

Слаўгарадскія сыравары маюць сваю краму, абсталяванне і... касцюмы. У Гіжэнцы і Рудні дзейнічаюць два цэнтры сыраварэння. Хатні сыр без розных там фарбавальнікаў і кансервантаў — тавар далікатны, бо можа хутка сапсавацца. Але на ўзбраенні сыравараў — мабільны прычэп «Купава». З ім яны амаль кожны месяц куды-небудзь адпраўляюцца. Нядаўна вунь былі ў Гомелі на першым экалагічным фестывалі, двойчы ўдзельнічалі ў фестывалі «Памежжа», які праводзіцца ў Смаленскай вобласці.

Галіна Таран, адна з першых сыравараў, успамінае, што захварэла гэтай справай яшчэ падчас работы ў Фондзе развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-агра». Аднойчы да іх зазірнула сяброўка Людміла Ерафеева і прапанавала пакаштаваць сыр хатняга вырабу. Прадукт так спадабаўся, што ідэю сыраварэння сталі прасоўваць.

### СНЫ ЦІМОШКІ І МАРЫ ВАДЗІМКІ

Для трэці сыравараў «Гіжэнскага аграрыя» сыраварэнне — адзіны даход. Астатнія сумяшчаюць справу з асноўнай работай. Алена Вараб'ёва, напрыклад, працуе бібліятэкарам у вёсцы Рудня, а ў свабодны ад работы час займаецца сырамі.

— Гэта занятак для душы і даход, — усміхаецца яна. — У сям'і чацвёра дзетак, трэба іх гадаваць. Сырамі занялася 7 гадоў таму і атрымліваю задавальненне. Дзякуючы гэтаму і свет пабачыла. Усе раёны вобласці аб'ехалі, ды і за яго межамі шмат дзе пабывалі.

Для Людмілы Бондаравай сыры — наогул прастора для творчасці. «Надзея» і «Раёк» атрымалі назвы ў гонар блізкіх сябровак, а вось «Цімошкіны сны» — даніна ўнуку. Дарэчы, не сыр — смаката. Шакаладны з разыначкамі. У гонар яшчэ аднаго ўнука названы не менш смачны сыр з сухафруктамі. Называецца «Вадзімкава мара».

Сыравары не хаваюць, што, для таго каб атрымліваць годны заробак, трэба павялічваць рэалізацыю. Цяпер асноўны прыбытак забяспечваюць вось такія фестывалі. На свяце ў Слаўгарадзе, напрыклад, атрымалася прадаць больш за 200 кілаграмаў сыроў. А ў міжфестывальны перыяд майстры выконваюць у асноўным толькі прыватныя заказы. Вядзецца актыўны пошук рынкаў збыту праз інтэрнэт. Ёсць ужо заяўкі з Мінска, Гомеля, Оршы...

### СУСЕДЗІ ПАКАШТАВАЛІ І АЦАНІЛІ

**Таццяна СЯМЁНАВА, начальнік аддзела па культуры і спорце адміністрацыі муніцыпальнай адукацыі Шумячыцкага раёна Смаленскай вобласці,** прыехала на слаўгарадскі фэст другі раз.

— Летась, пасля таго, як мы пабывалі ў Слаўгарадзе на фэсце, запрасілі іх да нас на фестываль «Парубежжа». Яны ў нас увесь сыр прадалі. Сёлета нашаму фестывалю спаўняецца 20 гадоў, так што разам са слаўгарадскімі артыстамі запрасілі і сыравараў. Усё ідзе да таго, што падпішам з раёнам дагавор аб супрацоўніцтве і будзем сябраваць больш цесна.

А **старшыня Слаўгарадскага райвыканкама Канстанцін ЖЫГУЦКІ** адзначае, што тутэйшыя сыравары заахвочваюць сваімі дзеяннямі і ўсё астатняе насельніцтва. Гэта, у сваю чаргу, добра адбіваецца на сацыяльна-эканамічным развіцці раёна.

— Людзі, якія маюць уласную падсобную гаспадарку, атрымалі магчымасць зарабляць грошы не выходзячы за межы свайго домаўладання. І колькасць ахвотных далучыцца да гэтай справы павялічваецца. Жыхары сталі набываць больш кароў для сваіх асабістых патрэб. Як вынік — павялічылася здача дзяржаве малака. Слаўгарадскі філіял «Бабулінай крынкі», дарэчы, спецыялізуецца на сырах: выпрабляе іх 36 відаў! Яны таксама прадстаўлены на фестывалі. Наогул, наш гастранамічны фэст яскрава дэманструе, як самазанятасць паляпшае дабрабыт насельніцтва.



Сыр нарасхват.

### УСЁ Ў НАС АТРЫМАЛАСЯ

На свяце, акрамя сыру, было шмат цікавага і карыснага. На асобнай пляцоўцы працавала турыстычная вёска, дзе школы Слаўгарадскага раёна ад душы частавалі хатнімі прысмакамі ў выглядзе блінцоў з тварагом, смачных баравічкоў, вэнджанага сала і іншай смакаты. І вельмі дарэчы прыйшоўся ў такую спякоту напой з журавін, якім карэспандэнта «МС» пачаставала загадчыца Лапаціцкага клуба Ларыса Кірыёнак. Абмінуць столік з на рэдкасць прыгожымі ручнікамі, якія яна дэманстравала, было проста не магчыма.

Як немагчыма было адвесці вока і ад гайтанаў, паясоў і бранзалетаў вытворчасці майстроў Магілёўскага аддзялення чыгуначнай дарогі. Упрыгожаныя беларускім арнаментам з дарагога чэшскага бісеру, яны выглядалі сапраўды шыкоўна. На нядаўнім міжнародным форуме «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця» гэтыя вырабы атрымалі высокую адзнаку.

Арганізатары свята зазывалі наведаць знакамітыя мясціны Слаўгарада, пакатацца на лодках, дэманстравалі іншыя мясцовыя ініцыятывы. Свята, адным словам, атрымалася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Святлана ЯЗЕРСКАЯ, старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Сёння хатняе сыраварэнне стала не проста брэндам Слаўгарадчыны. Гэта яшчэ і від занятасці насельніцтва, які садзейнічае развіццю асабістых падсобных гаспадарак і дапамагае павышэнню дабрабыту. Сёння на вёсцы вельмі важна кожнае працоўнае месца, усе тыя напрамкі, якімі можа займацца чалавек. У сваю чаргу хатняе сыраварэнне дае штуршок развіццю авечкагадоўлі, павелічэнню буйной рагатай жывёлы. У развіцці самазанятасці насельніцтва вялікая заслуга і дэпутацкага корпуса, бо мы працуем з кожнай ініцыятывай, з кожным сыраварам. Дапамагалі вырашаць пытанні з забеспячэннем пашай, утрыманнем жывёлы, рэалізацыяй прадукцыі, стварэннем сырнай крамы ў аграгарадку Лясная. Гэта вялікая работа. Сыравараў і авечкагадоўлю актыўна падтрымліваюць старшыня Лапаціцкага сельскага Савета Сцяпан Байцоў, Гіжэнскага — Мікалай Янкоў, іншыя дэпутаты. Гэта той кірунак, які абавязкова трэба падтрымліваць. Толькі разам можна дасягнуць патрэбных вынікаў, зразумець праблемы і знайсці шляхі іх вырашэння, якія дазволяць развівацца раёну.

# ВЫСЛУХАЛІ, ПАЧУЛІ. БУДЗЕМ РЭАГАВАЦЬ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Гэтай жа праграмай мяркуецца перавесці Цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя з Бараўлян у вёску Баравая. А на яго месцы плануецца адкрыць дзіцячую паліклініку.

За апошнія тры гады на тэрыторыі сельсавета былі пабудаваны тры дзіцячыя садкі. Першага верасня адкрыецца новая сярэдняя школа ў вёсцы Ляскоўка на 720 месцаў. У недалёкай перспектыве — будаўніцтва дзіцячага садка на 240 і сярэдняй школы на 1020 месцаў у вёсцы Бараўляны.

## Ажыўленне ў зале

Яно пачалося, калі перайшлі да абмеркавання пытанняў, якія датычыліся непасрэдна развіцця Дроздава. А жыхароў хвалявала многае: удасканаленне транспартных зносін, медыцынскага абслугоўвання, падвоз дзяцей у школы, экалагічная сітуацыя, уладкаванне тратуараў і дарог.

**Намеснік дырэктара — начальнік Дзяржаўнага ўпраўлення «Сталічны транспарт і сувязь» Андрэй ІЛАРЫЁНАЎ** канстатаваў, што перавозкі па гэтым населеным пункце ажыццяўляюцца гарадскім транспартам. У вёску ходзіць аўтобус № 146 і маршрутнае таксі № 1146. Колькасць рэйсаў значна перавышае ўстаноўленыя Саветам Міністраў нарматывы. У той жа час прапановы па карэкціроўцы часу адпраўлення пасажырскага транспарту і схемы руху па самой вёсцы яны гатовы разгледзець. Але для гэтага неабходна прывесці ў адпаведнасць з нарматывамі дарожную сетку, абсталяваць прыпынкі для бяспекі руху. Толькі ў гэтым выпадку маршрут будзе закальцаваны па некалькіх вуліцах Дроздава. Сітуацыю вывучала спецыяльная камісія, якая рэзюмавала, што тэхнічныя магчымасці дазваляюць гэта зрабіць пры захаванні ўсіх правілаў бяспекі. «Пасля паўторнага абследавання, думаю, пытанне будзе вырашана станоўча, — дадала Жанна Варабей. — Але гэта праблема не аднаго дня. Будзем працаваць над яе рэалізацыяй».

Цікавіла прысутных і тое, ці будуць наладжаны транспартныя зносіны паміж Дроздавам і Бараўлянамі. Некаторыя прапаноўвалі пусціць маршрутку з Мінска да Бараўлян з заходам у Дроздава і назад.

## Выйсце ёсць

— Усе прапановы мы прымем да ўвагі. Але, зразумела, імгненнага рашэння не будзе. Неабходна прааналізаваць, наколькі гэтыя маршрут будзе запатрабаваны і самаакупны, — зазначыла Жанна Аляксандраўна. Яна таксама дадала, што ў Мінскім райвыканкаме створана камісія па інвентарызацыі дарожнай сеткі раёна, складзены графік работ і па тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета. Гэтая камісія будзе выяўляць безгаспадарчыя дарогі ў населеных пунктах з мэтай перадачы іх на баланс пэўнай абслугоўвальнай арганізацыі. Паводле спісаў у Дроздаве налічваецца 25 «нічыйных вуліц», пабудаваных гаспадарчым спосабам.

— У Мінскім раёне няма свайго аўтобуснага парка, — нагадаў **намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр МЯКІННІК.** — Мы працуем з гарадскім ДУ «Сталічны транспарт і сувязь». У найбліжэйшы час плануецца сустрэча старшыні райвыканкама і дырэктара гэтага прадпрыемства, дзе будуць абмяркоўвацца ўсе пытанні.

> У студзені 2018 года зацверджана інвестыцыйная праграма будаўніцтва ў Мінскай вобласці. З 60 запланаваных аб'ектаў 11 прадугледжаны на тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета.

Яшчэ адзін выхад з сітуацыі параіў Андрэй Іларыёнаў. «Некалькі месяцаў таму створана аналагічная нашай арганізацыя ў Мінскай вобласці, якая ладзіць рэйсы з раённых цэнтраў у Бараўляны. Мне ўжо прыносілі на ўзгадненне маршрут Валожын — Мінск — Бараўляны, — сказаў ён. — Мы таксама не выключаем падобнае рашэнне па Дроздаве».

На шмат якія пытанні аўдыторыі адказала **начальнік сектара агульнай адукацыі аддзела адукацыі, спорту і турызму Мінскага райвыканкама Наталля МІХАДЗЮК.** Наталля Аляксандраўна абвергла інфармацыю аб тым, што большасць дзяцей з Дроздава вучацца ў Бараўлянах:

— Па стане на 1 студзеня 2018 года ў Дроздаве пражываюць 92 дзіцяці, якія атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю. Пераважная колькасць іх — 58 — наведваюць сталічныя школы і гімназіі розных форм уласнасці. Па дамоўленасці з установамі адукацыі Першамайскага і Савецкага раёнаў вашы дзеці могуць вучыцца там. У той жа час яны могуць набываць веды і ў навучальных установах Бараўлян, за якімі замацаваны населены пункт.

**Намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Анатоль СЯДЫХ** закрануў тэму медыцынскай дапамогі. Для таго каб адкрыць у Дроздаве фельчарска-акушэрскі пункт, як таго хочуць жыхары, неабходна памяшканне дзесьці на 50 квадратных метраў. Аднак такога ў вёсцы няма. Цяпер жыхары замацаваны за медыцынскай установай пасёлка Бальшавік, што за пяць кіламетраў ад іх. Сёння камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама вядзе перагаворы з галоўным упраўленнем аховы здароўя Мінаблвыканкама аб выдзяленні памяшкання на базе 30-й Мінскай паліклінікі для абслугоўвання жыхароў пасёлка Сонечны і вёскі Дроздава.

Напрыканцы ўдзельнікі сустрэчы прапанавалі і сваю кандыдатуру старасты — Ігара Забароўскага. Старшыня сельвыканкама адзначыла, што дадатковая трэба яшчэ выбраць упаважаных па вуліцах. На працягу месяца неабходна прапанаваць кандыдатуры, затым правесці асобны сход для выбару старасты.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## СЕЗОН ВОДНЫХ ПАХОДАЎ

**На працягу шасці дзён студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры вандравалі на байдарках па рацэ Нарачанцы, расказвае газета «Нарачанская зара» Мядзельскага раёна. Сямёра навучэнцаў разам з кіраўніком — старшым выкладчыкам кафедры спартыўнага і рэкрэацыйнага турызму БДУФК Яўгенам Сямёнавым — плылі па маршруце Занарач — рака Нарачанка — Чарэмшыцы — Забраддзе — вусце Нарачанкі.**

Як расказвае кіраўнік, на кожным курсе студэнты ходзяць у паходы розных відаў. Выбралі плыць па Нарачанцы з некалькіх прычын. Па-першае, з-за разнастайных пейзажаў і... розных перашкод. У вярхоўі рака моцна пятляе, на трэці дзень яна становіцца даволі шырокая, але сустракаюцца ўчасткі з паваленымі дрэвамі. Далей ужо да канца маршруту — толькі прыгожыя пейзажы. «Самым важным аб'ектам у канцы маршруту, непадалёку ад зліцця з ракой Віліяй, была лазня — зруб, закапаны ў зямлю. Але сёлета мы, калі прыехалі на стаянку, яе не знайшлі. Вельмі спадзяюся, што яе адновяць, бо гэта быў адметны аб'ект адпачынку турыстаў», — расказвае Яўген Сямёнаў. Таксама ён лічыць, што Мядзельскі раён вельмі прыдатны для развіцця воднага турызму. На яго думку, было б добра павялічыць колькасць абсталяваных стаянак, зрабіць да іх пад'езды. «Як прыклад магу прывесці стаянку «Стол» за вёскай Забраддзе ў Вілейскім раёне, — тлумачыць кіраўнік паходу. — Выдатная стаянка, кожны год карыстаемся: там альтанка з лаўкамі, вогнішча...»

## АДЗНАЧЫМ СТАГОДДЗЕ

**У мінулую суботу на Алеі Герояў у цэнтры Шклова адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака ў гонар 100-годдзя ўтварэння пагранічных войскаў, піша газета «Ударны фронт». У мітынгу, акрамя шклаўчан, удзельнічалі госці з Магілёва, Крычава, Чавус, Мінска і іншых гарадоў. Некаторыя прыехалі і з Расіі.**

Старшыня раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Давыдовіч звярнуўся да грамадзян: «Пагранічнікі — гэта надзейная апора дзяржавы, эліта ўзброеных фарміраванняў, школа патрыётаў і прафесіяналаў. Адкрыты сёння ў горадзе Шклове помнік стане месцам сустрэч ветэранаў пагранічных войскаў, воінаў-інтэрнацыяналістаў, афіцэраў, правядзення патрыятычных мерапрыемстваў, стане сімвалам мужнасці воінаў-пагранічнікаў».

## ПЧАЛЯР АД ПРОДКАЎ

**У Петрыкаўскім раёне на развіццё прадпрымальніцтва ў 2018-м было выдаткавана крыху больш за 11 тысяч рублёў. На гэтую суму заявіліся чатыры будучыя індывідуальныя прадпрымальнікі і атрымалі кожны па 2900 рублёў. Карэспандэнт газеты «Петрыкаўскія навіны» завітаў да іх у госці.**

У вёсцы Мышанцы жыве Аляксандр Шаўцоў, ён вырас у Расіі, на Браншчыне, але на пачатку 90-х пераехаў у Гомель. Продкі па мужчынскай лініі былі пчалярамі, і гэтая справа захапіла Аляксандра. Так здарылася, што 20 сем'яў пчол загінулі пасля таго, як нечым атруціліся. Вырашыў тады гаспадар, што трэба вуллі перавозіць далей ад цывілізацыі, прамысловых прадпрыемстваў і сельскагаспадарчых палеткаў. Так выпадкова на карце ён выбраў Мышанку. Пяць гадоў таму набыў тут сядзібу і пачаў перартвараць фантазіі ў рэальнасць.

Атрымаў субсідыю, і цяпер асноўная частка сродкаў, а гэта дзве тысячы рублёў, пойдуць на набыццё спецыяльнага інструмента — вальцоў для вырабу вашчыны. Дарэчы, вашчына — такі прадукт, які набыць пчалярам проста няма дзе. А пчаляроў і ў Мышанцы, і ў Церабаве зашмат. Цяпер у іх будзе магчымасць не толькі купіць, але і абмяняць воск на вашчыну з даплатай.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# КНІГА З ДАСТАЎКАЙ ДАДОМУ

## Як жывуць сельскія бібліятэкі

**У вёсцы Прыбарава, што на Брэстчыне, бібліятэка была з пасляваенных часоў. Размяшчалася яна ў клубе, цяпер так і называецца «клуб-бібліятэка». Яе гаспадыня Антаніна Антонаўна ГАЛЯКА працуе тут не вельмі даўно, а вось у культуры — ужо шмат гадоў. Пасля заканчэння Гродзенскага культасветвучылішча займалася клубнай работай на вёсцы. Апошнія дзесяцігоддзе працоўная дзейнасць звязала з бібліятэчнай справай.**

### Што чытаюць вяскоўцы?

— Непакоіць тое, што цяперашнія школьнікі не цягнуцца да кнігі. Яны прыбягаюць у бібліятэку, калі патрэбныя кнігі па праграме. Прыходзяць і тыя, у каго дома няма камп'ютараў, знайсці нешта ў інтэрнэце, раздрукаваць, таксама па праграме, калі ў школе задаюць рэфераты ці паведамленні па тым ці іншым прадмеце, — разважае Антаніна Антонаўна. — Найчасцей у бібліятэку цяпер прыходзяць пенсіянеры, бяруць класіку, дэтэктывы. Найбольшым попытам карыстаецца перыёдыка. Вясковая бібліятэка атрымлівае даволі многа газет. Цяпер яны дарагія, самі ведаеце. А ў нас ёсць аматары чытаць свежую прэсу.


Антаніна ГАЛЯКА.

Пытаю, ці не даводзяць планы на платных паслугах для бібліятэкі. Антаніна Галяка гаворыць, што такая практыка даўно адышла ў гісторыю. Якія там кнігі за грошы? Добра, калі так чытаць будуць. Асабліва важна заахвоціць дзяцей да чытання.

Школьнікі прыходзяць у клуб на заняткі гурткоў, між іншым зойдуць у бібліятэку. Іх стараюцца прыцягнуць да падрыхтоўкі святочных мерапрыемстваў. Самае галоўнае свята для Прыбарава — свята вёскі. Яго ідэалагічны мастацкі складнікі рыхтуе менавіта бібліятэка. Бо кожны год вызначаецца новы склад герояў дня. Гэта, напрыклад, самы сталы жыхар вёскі, самы творчы, найлепшы падворак, працавіты гаспадар.

— Ушаноўваем народжаных у гэтым годзе, тых, хто пабраўся шлюбам. Адным словам, усе значныя падзеі вёскі знаходзяць адлюстраванне на свяце. Галоўнае, каб нікога не забыцца, падрыхтаваць спісы, напісаць сцэнарый, — расказвае Антаніна Галяка. — Апошнім часам на дзень вёскі запрашаем вайскоўцаў з суседняй пагранічнай заставы. Таксама рыхтуецца паведамленне пра будні мяжы, гісторыю заставы. Наша вёска знаходзіцца ў памежнай зоне, дзяржаўная граніца, якая тут праходзіць, вядома, уплывае на жыццё Прыбарава. Пагранічнікаў людзі пастаянна бачаць у сябе на сходах, многія даўно сталі добраахвотнымі памочнікамі вартавых мяжы, а тыя сваім удзелам у такіх святах прыносяць пэўную іскрынку. Напрыклад, усім падабаецца пакаштаваць салдацкую кашу, паглядзець паказальныя выступленні вайскоўцаў. На гэтую тэму рыхтуецца і выстаўка кніг у бібліятэцы.

Паводле слоў Антаніны Галякі, апошнім часам вельмі шмат зроблена для паляпшэння іх старога будынка. Дзякуючы сродкам, якія выдзеліў аддзел ідэалогіі, культуры і па справах моладзі райвыканкама, летась замянілі вокны ў памяшканні, адразу стала цяплей. Таксама адрамантавалі само памяшканне і добраўпарадкавалі тэрыторыю каля бібліятэкі.

**Загадчык сектара культуры Брэсцкага райвыканкама Эла МАРОЗАВА** адзначае, што гэтая вясковая бібліятэка на добрым рахунку. Антаніна Антонаўна за сваю плённую працу не так даўно была адзначаная граматай раённага Савета. У бібліятэцы заўсёды ўтульна, і чытачы сюды прыходзяць з задавальненнем.

### Актыўныя пенсіянеры і лялечны гуртоК

А вось бібліятэка ў Паланечцы Баранавіцкага раёна яшчэ чакае рамонту. Летась памянялі вокны, а сёлета, спадзяецца **бібліятэкар Святлана ВЯЛЕНКА,** чарга дойдзе да столі, сцен ды падлогі. І тады зойммуць свае месцы два новыя сталы з крэсламі, якія разлічаныя для чытальнай залы. Дарэчы, у зону абслугоўвання гэтай установы культуры ўваходзяць тры вёскі: Паланечка, Рэпічы і Шчарбовічы. У картатэцы — 250 чытачоў. Ёсць і моладзь, і пенсіянеры, але кнігі і перыёдыку чытаюць пераважна людзі сталага ўзросту.

— Ёсць у мяне аматары чытання, якім ужо за восемдзесят гадоў, — расказвае Святлана Уладзіміраўна. — Некаторыя з іх рэдка выходзяць з хаты альбо не выходзяць наогул, але цікавасці да чытання не страцілі. Яны пакідаюць заяўкі па тэлефоне, я заношу літаратуру ім дадому. Гэта звычайна і кнігі, і перыёдыка. Вось, напрыклад, Соф'ю Канстанцінаўну Кабарыху, былую настаўніцу і актыўную чытачку «Звязды», мы нядаўна віншавалі з 85-годдзем. Яна не толькі чытае шмат літаратуры, але і збірае матэрыялы краязнаўчага характару, ведае многа пра мінулае нашых мясцін, з ёй вельмі цікава пагаварыць. Актыўны чытач і пенсіянерка Лідзія Паўлаўна Клімава.


Святлана ВЯЛЕНКА.

Я з задавальненнем наведваю сваіх чытачоў. Нярэдка гэта раблю ў суботу, калі прыязджаюць дзеці да маіх пенсіянераў. Тады між іншым пагаворым аб агульных справах вёскі, бо я яшчэ і дэпутат сельскага Савета. Нагадваю малодшаму пакаленню, што іх бацькам выдзеліць пэўную суму з пенсіі на добраўпарадкаванне могілак не вельмі проста. Бывае, што дзеці з гатоўнасцю гэта робяць за бацькоў. А яшчэ дзеці дзякуюць за клопат, што прыношу іх бацькам чытво проста ў хату, — кажа вясковы бібліятэкар.

Святлана Вяленка ў сельскай бібліятэцы працуе на палову стаўкі, на другую палову — у школьнай бібліятэцы. «Часам, — расказвае, — бегаю тудысюды, блізка ж. Ну прыйшоў чалавек кнігі памяняць, я яму скажу: прыйдзіце пасля 15 гадзін. Іду, адчыняю, мяняю, паспяваю да званка, калі на перапынку могуць дзеці прыбегчы ў школьную».

Яшчэ Святлана Уладзіміраўна вядзе гуртоК, дзе разам са школьнікамі стварылі невялікі лялечны тэатр. Яго ўдзельнікі рыхтуюць пастаноўкі, разыгрываюць сцэнкі з літаратурных твораў, якія выбіраюць самі. Паказваюць іх у малодшых класах, у дзіцячым садку, часам і ў дарослай аўдыторыі. На яе думку, дзяцей важна хоць нейкім чынам зацікавіць кніжнымі героямі, каб адцягнуць іх увагу ад камп'ютарна-мульцяшных персанажаў. «І заўважаеш, як на рэпетыцыях, здавалася б, простай, прымітыўнай сцэны малы чалавек вучыцца думаць, разважаць, — кажа бібліятэкар. — Мае гурткоўцы, як правіла, мае чытачы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Людміла КАРОЛЬ, намеснік дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага:**

— У вобласці зараз дзейнічае 401 сельская бібліятэка. У 44 з іх супрацоўнікі занятыя на няпоўны рабочы дзень — на 50 альбо 75 працэнтаў стаўкі. 11 устаноў з'яўляюцца інтэграванымі, значыць, працуе бібліятэка-клуб, некалькі адначасова з'яўляюцца школьнымі і сельскімі бібліятэкамі. Усё гэта зроблена, каб максімальна захаваць на вёсцы кніжную ўстанову культуры. Стараемся рэгулярна папаўняць іх фонды. Абсалютная большасць бібліятэк камп'ютарызаваная, яны маюць выхад у інтэрнэт і электронны каталог раённай бібліятэкі. Вясковыя бібліятэкары кожны год праводзяць вялікую колькасць мерапрыемстваў па прапагандзе кнігі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 31 мая 2018 года.**